ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 178 (28288)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У страі з Зеўсам і Норай

Субота ў школьным раскладзе

Бібліятэкі: тэрыторыі не-цішыні

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

«Бюджэт Беларусі на 2017 год плануецца сфарміраваць з прафіцытам Br1,4 млрд. Бюджэт прафіцытны ў сувязі з неабходнасцю вяртання знешняга і ўнутранага доўгу. Гэта азначае, што прафіцыт плануецца менавіта для гэтага — каб мы цалкам выканалі свае знешнія і ўнутраныя абавязацельствы. У 2017 годзе захаваецца сацыяльная накіраванасць бюджэту. Запланаваны апераджальны рост выдаткаў на ахову здароўя і адукацыю, гэтыя сферы будуць абаронены ў першую чаргу. У прыярытэце таксама нацыянальная абарона, рэалізацыя праектаў у сферы эканомікі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.09.2016 г.

Долар ЗША	1,9560 ▼
Еўра	2,1957 ▼
Рас. руб.	0,0301 ■
Укр. грыўня	0,0743 ▼

ISSN 1990 - 763X

ТВОРЫ БАНДАРНАГА МАСТАЦТВА

Народны майстар Беларусі, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Уладзімір СТАНКЕВІЧ жыве ў Глуску і прапагандуе рамяство, якім яшчэ ў нядаўнія часы славілася ці не кожная вёска. Цяпер Уладзімір Іванавіч, лічы, адзіны спецыяліст па бондарстве на ўсю Магілёўшчыну. Таму яго запрашаюць на самыя значныя фестывалі, якія праводзяцца ў краіне, а яго вырабы карыстаюцца ў гаспадароў заўсёдным попытам. Спрадвечнае рамяство цалкам захапіла былога рачнога матарыста. Уладзімір Іванавіч працуе ў раённым Доме рамёстваў, перадае свае веды маладым бондарам.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Праз некалькі дзён на партале «Звязды» можна будзе ўбачыць фотарэпартаж, як вядомы бондар у невялікай майстэрні робіць сапраўдныя бочку і кадушку.

■ Белая вежа — 2016

Каб не апынуцца на востраве

Першыя здабыткі і расчараванні брэсцкага тэатральнага фестывалю

Тэатральнае свята працягваецца ў Брэсце. На яго адкрыцці старшыня гарвыканкама Аляксандр Рагачук запэўніў прысутных, што фестываль, які стаў культурным брэндам горада, будзе жыць далей. І гэта вельмі радуе. Сёння, калі адняць не толькі ад культурнага, але і ў цэлым ад грамадскага жыцця міжнародны форум тэатраў, дык брэсцкая восень стане самай звычайнай восенню правінцыяльнага горада. А калі да нас прыязджаюць тэатралы з розных канцоў свету, то ёсць нагода адчуць сябе часткай сусветнага культурнага працэсу. Асабліва калі пашчасціць патрапіць у сапраўдны тэатр.

ХОЦЬ гэтым разам, варта адзначыць, такіх узрушэнняў, якія летась, напрыклад, выклікала пастаноўка рыжскага тэатра «Фро», пакуль не здарылася. Можа, сапраўдныя адкрыцці чакаюць нас напярэдзе. Але і першыя дні падарылі некалькі сустрэч з добрым тэатрам. Найперш трэба сказаць пра вулічны спектакль **«Чайка»** Львоўскага акадэмічнага тэатра «Уваскрэсенне».

Названы калектыў на брэсцкім форуме — не навічок, а адзін з самых надзейных сяброў. Вулічныя пастаноўкі львоўскай трупы ў папярэднія гады заваёўвалі гран-пры, адзначаліся іншымі ўзнагародамі, а галоўнае, выклікалі захапленне публікі. І на гэты раз любімы тэатр не падмануў чаканняў!

СТАР. 13

■ Сіла — ёсць!

ПАЎТОНЫ НА ПЛЯЧАХ

Наш няштатны аўтар наведаў вёску Дабромысль Івацэвіцкага раёна — гэты аддалены населены пункт славіцца сваімі асілкамі, мускульная маса якіх нарошчваецца ў асноўным пад адкрытым небам. Прычым пра поспехі хлопцаў ведаюць далёка за межамі Дабромысля.

СТАР. 4

Руслан БАГІРАЎ цяжкасцяў не баіцца.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Выбары-2016

АСОБЫ ВЯДОМЫЯ І ЎПЛЫВОВЫЯ

Мясцовыя Саветы выбралі сваіх прадстаўнікоў у Савет Рэспублікі

Нагадаем, Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. У яе ўваходзяць 64 члены. Пры гэтым 56 з іх выбіраюцца — па восем ад кожнай з абласцей і ад Мінска, яшчэ восем сенатараў назначае Прэзідэнт. Нашы карэспандэнты пабывалі на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў і паглядзелі, як выбіраюць парламентарыяў у верхнюю палату.

Брэсцкая вобласць.
Кожны дабіўся поспеху

У склад Савета Рэспублікі ад Брэсцкай вобласці ўвайшлі: Віктар АМБРАЖЭЙЧЫК, дырэктар Драгічынскага лясгаса; Іван АНТАНОВІЧ, дырэктар прадпрыемства «Новая Прыпяць» Столінскага раёна; Рыгор БЫСЮК, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»; Ніна ДУДАРГА, начальнік Лунінецкага раённага вузла паштовай сувязі; Вольга ЛЕЎЧАНКА, дырэктар-рэдактар газеты «Пінскі веснік»; Васіль МАРКЕВІЧ, генеральны дырэктар птушкафабрыкі «Дружба» Баранавіцкага раёна; Васіль РАМАНОЎСКІ, галоўны ўрач Баранавіцкай цэнтральнай паліклінікі; Віктар ЧАЙЧЫЦ, старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў.

Яшчэ на этапе прадстаўлення кандыдатаў адзначалася, што ўсе яны вядомыя ў сваіх рэгіёнах людзі. Кожны дабіўся пэўных поспехаў на працоўнай ніве ў сваёй галіне. З выбраннем сенатараў павіншаваў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС і выказаў спадзяванне, што яны плённа папрацуюць на карысць радзіме.

Віцебская вобласць.
Перайманне вопыту забяспечана

Тут у галасаванні прынялі ўдзел 659 дэпутатаў мясцовых Саветаў. У выніку выбрана восем членаў Савета Рэспублікі, з якіх трое ўжо працавалі ў яго мінулых складах — гэта дырэктар Талачынскага кансервавага завода Анатоль АНЮХОЎСКІ, гендырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» Мікалай МАРТЫНАЎ і гендырэктар прадпрыемства «Віцебскаблгаз» Пётр ШЭРШАНЬ. Членамі Савета Рэспублікі таксама выбраны начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯРКАЧ, дырэктар ААТ «Полацктранснафта Дружба» Васіль ДРОБАТАЎ, дырэктар рэгіянальнай тэлерадыёкампаніі «Віцебск» Алена ПАНЦЮХОВА, старшыня Полацкага райвыканкама Мікалай ШАЎЧУК, рэктар Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта Анатоль ШЧАСНЫ.

Гомельская вобласць.
Праблемы раёнаў — на ўзроўні дзяржавы

Больш за 400 дэпутатаў Саветаў базавага ўзроўню з'ехаліся ў Гомель, каб выбраць тых, хто будзе прадстаўляць інтарэсы рэгіёна ў верхняй палаце парламента. Усе прадстаўнікі Гомельшчыны ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ў наступныя чатыры гады — асобы вядомыя і ўплывовыя.

Дырэктар сярэдняй школы №16 Мазыра Аксана КАВАЛЬКОВА мае і медыцынскую, і педагагічную, і эканамічную адукацыю. Бясспрэчным аўтарытэтам нават сярод мужчын-калег карыстаецца дырэктар акцыянернага таварыства «Зорка» Чачэрскага раёна Галіна ТРЫБУНАХ. Некалькі гадоў таму сельгаспрадпрыемства аб'ядналі з чатырма аграфірмамі і паставілі задачу — выйсці ў лідары. Мэты дасягнуты: цяпер у прадпрыемства найлепшыя паказчыкі ў вобласці.

Сярод выбраных ад вобласці таксама начальнік Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі Рыгор ДВОРАК, генеральны дырэктар аб'яднання «Беларуснафта» Аляксандр ЛЯХАЎ, генеральны дырэктар прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» Ігар КРАЎЧАНКА, галоўны ўрач Гомельскай клінічнай бальніцы №1 Алег ЯДРАНЦАЎ, рэдактар жлобінскай газеты «Новы дзень» Галіна МЕЛЬНІКАВА, а таксама першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.

Гродзенская вобласць.
Прафесіяналы з веданнем справы

Усе вылучаныя кандыдатуры па выніках тайнага галасавання, у якім удзельнічалі 368 дэпутатаў, былі падтрыманы. Такім чынам, прадстаўляць рэгіён у верхняй палаце парламента будуць старшыня Лідскага раённага Савета дэпутатаў Інэса БЕЛУШ, генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната Анатоль ГРЫШУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК, галоўны ўрач Гродзенскай абласной клінічнай інфекцыйнай бальніцы Алена КРАТКОВА, старшыня Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта Міхаіл СІЦЬКО, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Раманія СКАМАРОШКА, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Віктар СНЯЖЫЦКІ, старшыня СВК «Азёры Гродзенскага раёна» Аляксандр ШЫШКО.

— Праслухаўшы праграмы кандыдатаў, я яшчэ раз пераканаўся, што будучыя сенатары ад рэгіёна — прафесіяналы з веданнем справы, неабыякавыя людзі. Яны могуць шмат зрабіць для ўдасканалення законаў, каб паспяхова вырашаць задачы, пастаўленыя V Усебеларускім сходам і прадугледжаныя праграмай развіцця краіны на пяцігодку, — лічыць старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.

Магілёўская вобласць.
І рэктары, і дырэктары

У галасаванні прынялі ўдзел 449 дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню і гарвыканкамаў. Яны падтрымалі ўсе вылучаныя кандыдатуры ў сенатары: дырэктара тэлерадыёкампаніі «Магілёў» Ірыны АКУЛОВІЧ, дырэктара Магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Мікалая АЛДАНАВА, дырэктара ААТ «Новая Друць» Анатоля ДРАЗДОВА, гендырэктара Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання Барыса КАВАЛЕЎСКАГА, гендырэктара «Магілёўэнерга» Канстанціна ПУЦІЛЫ, галоўнага ўрача Глускай цэнтральнай райбальніцы Ірыны ПЯТРОВАЙ, рэктара Магілёўскага дзяржаўнага абласнога інстытута развіцця адукацыі Ірыны СТАРАВОЙТАВАЙ, а таксама старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА.

Мінская вобласць.
Каб дзеці жылі ў згодзе і дастатку

У тайным галасаванні па выбарах членаў Савета Рэспублікі прынялі ўдзел 639 дэпутатаў, або 85% ад усяго дэпутацкага корпуса цэнтральнага рэгіёна.

Членамі Савета Рэспублікі ад Міншчыны сталі старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Беларускалій» Іван ГАЛАВАТЫ, дырэктар унітарнага прадпрыемства «Азярыцкі-Агра» Ніна ЖАЛЯЗНОВА, дырэктар па прамыслова-тэхнічнай палітыцы і развіцці адкрытага акцыянернага таварыства «БАТЭ» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты» Аляксандр МАРЧАНКА, старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву «Агракамбінат Сноў» Нясвіжскага раёна Мікалай РАДАМАН, намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Віктар СІРЭНКА, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Алег СУКОНКА.

Нававыбраных сенатараў павіншаваў Сямён Шапіра.

— Глыбока перакананы, што ўсе яны сапраўдныя патрыёты нашай зямлі, якія будуць фарміраваць заканадаўчую базу краіны для таго, каб мы, нашы дзеці і ўнукі жылі ў міры, згодзе і дастатку, — адзначыў старшыня Мінаблвыканкама.

Мінск.
Вырашаць задачы дзяржавы

Ад сталіцы ў Савет Рэспублікі выбраны: намеснік міністра юстыцыі Ала БОДАК, дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін ВІЛЬЧУК, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына ДУЛАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Японіі Сяргей РАХМАНАЎ, кіраўнік РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак Алег РУМО, міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч у сваім выступленні на пасяджэнні выказаў думку, што Савет Рэспублікі павінен актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач, якія стаяць перад дзяржавай.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Ірына АСТАШКЕВІЧ,
Барыс ПРАКОПЧЫК,
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Надзея ЮШКЕВІЧ

■

УСХОДНІ ВОПЫТ З ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПАПРАЎКАЙ

Новы беларускі пасол у Кітаі расказаў «Звяздзе», чаго можна чакаць ад сустрэчы кіраўнікоў дзвюх краін і якіх партнёраў паважаюць у Паднябеснай

Доктар эканамічных навук, у нядаўнім мінулым дарадца Адміністрацыі Прэзідэнта па эканамічных пытаннях, кітаязнаўца, а таксама складальнік і адзін з аўтараў кнігі «Фінансавая дыета» Кірыл РУДЫ быў прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у КНР 12 ліпеня гэтага года. Учора ён уручыў Старшыні КНР Сі Цзіньпіну даверчыя граматы. Мы сустрэліся з ім у беларускім пасольстве ў Пекіне 11 верасня, у дзень асноўнага галасавання за кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. У той дзень у пасольства прыйшло шмат людзей, і кіраўнік беларускай дыпламатычнай місіі змог удзяліць увагу кожнаму, хто жадаў з ім пагутарыць. Журналіст «Звязды» таксама скарыстаўся шанцам, каб задаць некалькі пытанняў.

— Кірыл Валянцінавіч, вы ўжо месяц знаходзіцеся ў Кітаі ў якасці Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь. Якія першыя ўражанні ад новай пасады?

— Уражанні зводзяцца цяпер да досыць напружанай працы, бо мы рыхтуем візіт кіраўніка нашай дзяржавы, які адбудзецца ў канцы верасня. Таму ўсе сілы кінуты на падрыхтоўку дакументаў па напаўненні візіту, па арганізацыі кітайскіх дзелегацый у Беларусь і беларускіх — у Кітай. Зараз адбываецца падвядзенне пэўных вынікаў мінулых сустрэч прэзідэнтаў дзвюх краін і фарміраванне планаў на будучыню.

— Якія чаканні ад гэтага візіту?

— Ёсць галоўныя сферы, якія будуць вырашаць самі прэзідэнты. Мы рыхтуем дакументы, якія будуць імі падпісаныя на падставе іх асабістай дамоўленасці.

Што да эканамічнага напаўнення, то плануецца супрацоўніцтва ў сферы вытворчых патэнцыялаў. Гэты тэрмін, які выкарыстоўваецца ў Кітаі, мае на ўвазе стварэнне сумесных прадпрыемстваў. Напрыклад, дырэктар буйной кітайскай кампаніі Zoomlion па вытворчасці кар'ернай і спецыялізаванай тэхнікі (аналаг нашага МАЗа) ужо быў у Беларусі, сустракаўся з Прэзідэнтам, і ўжо маюцца планы па стварэнні сумесных прадпрыемстваў. Таксама прапрацоўваюцца дамоўленасці аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў з БелАЗам, таму ў прынцыпе нашы буйныя беларускія брэнды, калі яны паспяхова правядуць перамовы і падпішуць канкрэтныя дакументы падчас гэтага візіту, маюць добры шанц палепшыць свой фінансавы стан.

— Гэтыя дамоўленасці могуць стаць прарыўнымі?

— Усё залежыць ад таго, наколькі бакі зацікавяць адзін аднаго. Гэта могуць быць і невялікія кантракты, якія на фоне ўсяго супрацоўніцтва не акажуць прарыўнога ўплыву для нашых прадпрыемстваў. Трэба дачакацца вынікаў.

— Кітай для вас ужо вядомая краіна. Ці сутыкнуліся вы з нейкімі новымі момантамі за гэты месяц?

— З-за інтэнсіўнасці работы, якая цяпер адбываецца, цяжка прааналізаваць і зразумець, што тут змянілася. Але ў цэлым Кітай паважае кампетэнтных людзей, якія адстойваюць свае інтарэсы, заяўляюць пазіцыю; людзей падрыхтаваных, паслядоўных, якія выконваюць свае абавязацельствы. На гэтым заснаваны сапраўдны Кітай. Ён рашучы і паслядоўны. Гэта значыць, прымае рашэнні і крок за крокам ідзе да іх рэалізацыі. Калі яго партнёры нерашучыя і непаслядоўныя, то гэта выклікае недавер з боку кітайскіх партнёраў.

— Наколькі беларускі бок, на ваш погляд, бывае гатовы весці справу з Кітаем?

— Я заўважыў, што ў нас да Кітая полюсныя адносіны: з аднаго боку, мы яго лічым панацэяй ад усіх праблем, лічым, што кітайскі вопыт унікальны і трэба яго пераймаць без аглядкі.

Між тым у Кітаі вялізная колькасць нацыянальных меншасцяў, гэта найвялізнейшая краіна, дэ-факта федэратыўная, тут шмат правінцый. Акрамя таго, Кітай мае багатую тысячагадовую гісторыю. У Кітая вельмі шмат спецыфікі, якую мы не ўлічваем, калі спрабуем слепа капіраваць кітайскі вопыт.

З другога боку, існуе думка, што Кітай — гэта нешта зусім асаблівае, што яго вопыт ніколі нельга выкарыстоўваць у нас. Я займаю больш цэнтрысцкую пазіцыю, імкнуся згладжваць вострыя вуглы і лічу, што варта выбіраць элементы, фрагменты з кітайскага вопыту, прыглядацца, праводзіць эксперыменты. Калі атрымліваецца — укараняць, калі не атрымліваецца — значыць, гэта не наша. Мы невялікая еўрапейская краіна, і трэба глядзець на наш патэнцыял, на наш рэзерв трываласці.

— Што з кітайскага вопыту вам здаецца найбольш цікавым на сённяшні момант?

— У 2015 годзе старшыня Кітая Сі Цзіньпін асабіста аб'явіў структурную рэформу прапановы.

Ён сказаў, што праблема ў эканоміцы не ў тым, што няма попыту, а ў тым, што прапанова неадэкватная. Кітайцы купляюць шмат імпартных рэчаў, плацяць грошы замежным вытворцам, бо тое, што ім прапануецца ўнутры Кітая, горшай якасці. Таму трэба мяняць сістэму прапановы. І галоўны акцэнт рабіць на неэфектыўных прадпрыемствах. Або закрываць іх (і тады даваць людзям новыя працоўныя месцы), або аб'ядноўваць найбольш моцных з тым, каб тыя выходзілі на сусветны рынак і былі больш канкурэнтаздольнымі. У Кітаі, дарэчы, не аб'ядноўваюць моцнага са слабым, каб тым самым не аслабіць першага. Аб'яднаныя такім чынам прадпрыемствы выштурхоўваюць за мяжу, каб яны там асвойваліся і канкурыравалі.

Гэта цікавая рэформа, якая сёлета праводзіцца, яе яшчэ складана ацаніць, але дакладна відаць, што яна рашучая і паслядоўная. У такіх галінах, як металургія, сталеліцейная прамысловасць, Кітай паставіў планы па закрыцці прадпрыемстваў, скарачэнні вытворчасці і нават стымулюе кампаніі, якія закрылі свае магутнасці. Калі ў Беларусі часам ставяцца мэты павялічыць вытворчасць, то тут мэта — неэфектыўныя вытворчасці скараціць. Гэта робіцца, каб аздаравіць эканоміку і зрабіць рост яе больш устойлівым.

Думаю, гэты вопыт трэба вывучаць, прыцягваць у Беларусь кітайскіх экспертаў, каб яны расказвалі пра яго і дзяліліся. Трэба, каб сюды прыязджалі нашы дэлегацыі не толькі дзеля заключэння кантрактаў на ўзроўні прадпрыемстваў, але каб прыязджалі тыя, хто фарміруе эканамічную палітыку на ўзроўні міністэрстваў, каб яны на месцы ўбачылі, як праводзіцца такая палітыка ў Кітаі.

— Апошняе пытанне бытавога плана. Як гэты месяц прайшоў для вас і супрацоўнікаў пасольства? Наколькі ўсе ўладкаваліся?

— У жніўні было вельмі горача. Мы ўсе вельмі рады, што надвор'е нарэшце стала камфортным. Нас усе пужалі смогам, але пакуль што мы бачылі, як правіла, чыстае неба, прыгожыя аблокі. Так што жывём няблага.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
г. Пекін.

■ Грошы

ЦЭНЫ — НАЗАД

Упершыню за апошнія 6 гадоў у нашай краіне была зафіксавана невялікая дыфляцыя

На самой справе памяншэнне цэннікаў у асноўным тлумачыцца сезонным характарам, але ў апошнія гады падобнага не назіралася ўвогуле. А тут маем факт патаннення, бо... Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн за тавары і паслугі ў жніўні ў параўнанні з ліпенем склаў 99,9%. Атрымліваецца, што ў жніўні ў сярэднім у нас адбылося патанненне прыкладна на 0,1%.

У лідарах — гародніна

Зразумела, што ў апошні месяц лета ўсе мы чакаем зніжэння цэн на прадукты харчавання. І сёлета нам пашанцавала. Істотней за ўсё ў жніўні апусціўся цэннік на гародніну, якая толькі за месяц патаннела амаль на траціну. Напрыклад, салодкі перац, морква і капуста пачалі прадавацца на 31% танней, буракі на 29%, а памідоры — увогуле на 56%. Таксама было зафіксавана зніжэнне цэн і на садавіну (мінус 4,6%). Напрыклад, бананы патаннелі больш як на 10%, а яблыкі — амаль на 6%. Аднак існуюць у нашай табліцы прадуктаў харчавання і «парушальнікі спакою». Так, за мінулы месяц ажно на 11% падаражэлі апельсіны і лімоны, на 5% — цукар і на 2% — распушчальная кава. Прыкладна на 0,7% павялічыліся цэны на малако і малочныя прадукты, а на мяса — ужо на 1%. Практычна не змяніліся агульныя цэны на паслугі (плюс 0,01%), а тарыфы ў жыллёва-камунальным сектары нават на 0,02% знізіліся.

Мінусуе летні асартымент

А вось з нехарчовымі таварамі сітуацыя крыху іншая. Тут за жнівень было адзначана невялікае падаражанне (плюс 0,3%). Мацней за ўсё прыбавіў цэмент (плюс 3,6%), халадзільнікі (плюс 3,5%) і аконнае шкло (плюс 2,4%). Па гэтай катэгорыі тавараў таксама не ўсё так кепска. Ужо ў жніўні пачаў сур'ёзна таннець менавіта летні асартымент. За мінулы месяц мацней усяго былі падкарэктаваны цэны на мужчынскія басаножкі (мінус 5,7%), летнія падлеткавыя (мінус 4%) і жаночыя (мінус 6,4%) туфлі і купальнікі (мінус 2,6%). Гэта таксама паказчык, але рэальнаму пакупніку — як хваробе кашаль. Мне здаецца, што купальнікі і басаножкі восенню будзе купляць толькі сапраўды экстравагантны кліент.

Былі на максімуме?

Наконт гэтага фінансавыя аналітыкі ад бізнесу адзначаюць, што цэны на агародніну знізіліся так істотна, бо наша вялікая суседка ўжо не купляе ў нас гэтыя прадукты ў неабмежаванай колькасці па максімальных цэнах. А на сваім рынку насельніцтва пачало больш эканоміць, бо даходы ў апошні час не павялічваліся. Пэўную ролю тут адыгрывае і памяншэнне інфляцыйных чаканняў як на ўзроўні айчынных вытворцаў, так і сярод фермераў і індывідуальных прадпрымальнікаў.

А яшчэ ёсць погляд, што цэны ўжо і так папярэдне дасягнулі сваёй верхняй мяжы. А цяпер, каб прывабіць масавага пакупніка, буйныя кампаніі былі вымушаны зніжаць свае апетыты і, адпаведна, цэны.

Пад адміністрацыйным кантролем

Існуе ў Белстата і яшчэ адзін цікавы паказчык. Гэта базавы індэкс спажывецкіх цэн (БІСЦ). Ён ужо выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя трапіць пад уплыў фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару. А такі БІСЦ у жніўні ў параўнанні з ліпенем не паменшыўся, а склаў 100,5%.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Параалімпійскія гульні

Залатыя вы нашы!

Зборная Беларусі заваявала два залатыя медалі ў шосты дзень спаборніцтваў Параалімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра, здолеўшы падняцца на 13-е месца ў неафіцыйным агульнакамандным заліку.

Уладзімір ІЗОТАЎ.

13 верасня ў складзе нашай каманды золата заваявалі Андрэй Праневіч (індывідуальная шпага) і Уладзімір Ізотаў (плаванне на 100 м брасам). Такім чынам, у актыве зборнай Беларусі ўжо сем узнагарод Гульняў-2016: пяць залатых і дзве бронзавыя. Раней адзін бронзавы і тры залатыя медалі заваяваў плывец Ігар Бокій, яшчэ адна бронзавая ўзнагарода ў актыве кідальніка кап'я Аляксандра Трыпуця.

Прэзідэнт Беларусі, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў членаў нацыянальнай каманды па інваспорце Андрэя Праневіча і Уладзіміра Ізотава з заваяваннем залатых медалёў на Параалімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра. Кіраўнік дзяржавы пажадаў спартсменам і трэнерскаму калектыву нацыянальнай каманды моцнага здароўя і новых поспехаў.

У спаборніцтвах на шпагах сярод жанчын дзве беларускі выйшлі ў васьмёрку наймацнейшых. Алеся Макрыцкая саступіла немцы Сімоне Брызе-Батке, якая заняла ў турніры 4-е месца, а Настасся Касцюшкова саступіла кітаянцы Чжой Цзыньцзынь, якая, перамогшы беларуску, у фінале заваявала залатую ўзнагароду.

Першае месца ўпэўнена займаюць кітайцы, якія за шэсць дзён ужо заваявалі 63 залатыя, 51 сярэбраны і 33 бронзавыя ўзнагароды. Другі радок займае зборная Вялікабрытаніі, на рахунку якой 34 залатыя, 18 сярэбраных і 23 бронзавыя ўзнагароды. На трэцім месцы размяшчаецца каманда Украіны, у актыве якой 72 медалі (27-21-24).

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

Фота БЕЛТА.

Андрэй ПРАНЕВІЧ.

■ Мы і дзеці

«ТАТАЎ ДЗЕНЬ — КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

Актыўна ўдзельнічаць у выхаванні дзяцей, бавіць з імі вольны час, быць узорам для малых і атрымліваць ад гэтага асалоду — на такія бадзёрыя ідэі і дзеянні натхняе татаў і тых, хто збіраецца імі стаць, дабрачынная арганізацыя «Клуб ільвоў». Чарговае сямейнае свята ў межах акцыі «Татаў дзень — кожны дзень» «ільвы» на выхадных ладзілі сумесна з татамі і дзецьмі з футбольнага клуба «Дынама-Мінск».

Ідэя, да якой імкнуцца ў абодвух клубах, — праводзіць выхадныя разам са сваімі дзецьмі, прычым рабіць гэта актыўна, а не лежачы на канапе. Рэалізавалі гэтую думку праз міні-матчы татаў і дзяцей на стадыёне «Дынама-Юні».

— Гэта той выпадак, калі на працу ў выхадны дзень ідзеш з задавальненнем, — зазначыў **Васіль КНЯЗЮК, прэс-аташэ футбольнага клуба «Дынама-Мінск».** — Таты адклалі свае тэлефоны і на паўдня цалкам засяродзіліся на дзецях і гульні. Галоўным пры гэтым быў не лік, а ўдалы пас свайму малому. Каштоўнасць шчырых дзіцячых эмоцый і задавальнення пры гэтым вымераць проста немагчыма.

«Таты правялі паўдня разам на эмоцыях з дзецьмі, а не з малатком ці рыдлёўкай, гэта цудоўна. Разам з «Клубам ільвоў» мы ідзем у адну нагу і ў адным кірунку. І такая сумесная акцыя дакладна не будзе апошняй», — дадаў прадстаўнік «Дынама-Мінск».

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

■ Ну і ну!

МАРЫХУАНА Ў... ПАМІДОРАХ

У сталіцы затрымалі 27-гадовага мужчыну, які па месцы жыхарства арганізаваў вырошчванне марыхуаны.

У яго канфіскавалі больш за 34 грамы марыхуаны, а таксама дарагое абсталяванне. Памяшканне пад «плантацыю» было на балконе кватэры пад выглядам схаванай «каморкі». Па інфармацыі Фрунзенскага РУУС г. Мінска, насенне канопляў затрыманы прывозіў з Галандыі і Індыі. «Гатовы прадукт» захоўваў у халадзільніку, каб не было паху. Марыхуану ўжываў сам і збываў знаёмым. Каб замаскіраваць яе вытворчасць, малады чалавек вырошчваў таксама памідоры. Зараз грамадзяніну пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да васьмі гадоў. Мужчына дагэтуль не быў судзімы, працаваў інжынерам у буйной кампаніі і меў добрую крыніцу даходу.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ВЫСЛУХАЮЦЬ І ДАПАМОГУЦЬ КОЖНАМУ

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 17 верасня чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на тэлефонныя званкі будуць адказваць:

Брэсцкі аблвыканкам: намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам: намеснік старшыні БЕЛАУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам: першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам: старшыня КРАЎЦОЎ Уладзімір Васільевіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам: старшыня Савета дэпутатаў ІСАЧАНКА Анатоль Міхайлавіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам: старшыня Савета дэпутатаў МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам: намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васільевіч (80172224444).

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ВІДЭАРЭГІСТРАТАР НЕ ПАДМАНЕШ

Гродзенскае тралейбуснае ўпраўленне набыло відэарэгістратары, з якімі неўзабаве будуць працаваць на лініі ўсе брыгады кантралёраў грамадскага транспарту.

Такім чынам, усе праверкі пасажыраў на наяўнасць праязных дакументаў будуць запісвацца на відэа (з фіксацыяй гуку) і па заканчэнні рабочага дня паступаць у інфармацыйную базу тралейбуснага ўпраўлення. Відавочна, што гэта спатрэбіцца ў спрэчных сітуацыях, якія, здараецца, узнікаюць ва ўзаемаадносінах паміж кантралёрамі грамадскага транспарту і пасажырамі. Ды і сам факт наяўнасці відэарэгістратара можа папярэдзіць канфлікт.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

«ЛЯ АРЭСЫ, ЦІХАЕ РАКІ»

Трэцяе абласное свята мастацтваў «Палескія сустрэчы» пройдзе 17 верасня ў Любані ў рамках святочных урачыстасцяў, прымеркаваных да 450-годдзя горада і Года культуры.

Як адзначыў **мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл ФІНБЕРГ**, «Палескія сустрэчы» адрозніваюцца ад іншых свят, што праводзіць аркестр. Тут праграма прадугледжвае і класіку, і эстраду, і джаз. «Мы адналькава ставімся да ўсіх кірункаў. Галоўнае, каб музыка была напісана і выканана прафесіянальна, а таксама мела нацыянальную аснову», — падкрэсліў маэстра.

У рамках «Палескіх сустрэч» адбудзецца ўручэнне пасведчанняў аб прысуджэнні прэмій Спецыяльнага Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы тэленавітай моладзі лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў Міншчыны.

У Любанскай школе мастацтваў таксама адбудзецца прэзентацыя выстаўкі «Да Любані з любоўю», у якой арганічна спалучаюцца творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і жывапісу. Тут будуць прадстаўлены работы мясцовых мастакоў, сяброў супольнасці «Абуджэнне» і творцаў з Паўла-Пасадскага раёна Маскоўскай вобласці.

Але галоўнай валадаркай свята «Палескія сустрэчы» будзе музыка. Пройдзе і канцэрт-лекцыя «Эксклюзіўныя музычныя інструменты ў беларускай музыцы XIX-XX стагоддзяў», і канцэрт класічнай музыкі «Над ракой Арэсай. Мікалай Аладаў і яго паплечнікі». Падарункам жыхарам і гасцям горада стане вялікі святочны канцэрт «450-годдзю Любані прысвячаецца».

Васіль КАТКАВЕЦ.

СУВЯЗЬ І ПАДАРАЖЭЕ, І ПАТАННЕЕ

Аператар Velcom з 25 верасня павышае цану на некаторыя паслугі.

У прыватнасці, павялічыцца абаненцкая плата, кошт выходнага галасавога трафіку некаторых тарыфных планаў, пакетаў мабільнага інтэрнэту, SMS, MMS, міжнародных званкоў, роўмінгу, аднаразовых узносаў, а таксама спецыяльных і дадатковых паслуг.

«Кошт хвілін на большасці тарыфных планаў для фізічных і юрыдычных асоб застанецца нязменным, а на тарыфных планах «Прывітанне, гарадок», «Прывітанне, землякі», «Наш гарадок», «Вам грошы» і «Сувязь без абавязацельстваў» у шэрагу тарыфных зон адбудзецца істотнае зніжэнне кошту званкоў у іншыя сеткі», — паведамляецца на сайце мабільнага аператара.

Без змен захаваюцца памеры штомесячных плацяжоў за абсталяванне, абаненцкая плата тарыфных планаў фіксаванага інтэрнэту, кошт мегабайта тарыфнага плана, у тым ліку звыш трафіку, уключанага ў тарыфны план або пакет мабільнага інтэрнэту.

З новымі тарыфамі можна будзе азнаёміцца на сайце аператара.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ПАЛЯЎНІЧЫ ЗАБІЎ ПАЛЯЎНІЧАГА

Трагедыя адбылася каля вёскі Плянта Кобрынскага раёна.

57-гадовы мужчына выстраліў па дзіку, а пацэліў у 35-гадовага таварыша па паляванні. Ад атрыманага ранення пацярпелы памёр.

Як паведамілі ў Брэсцкай абласной інспекцыі па ахове жывёльнага і раслінnага свету, прычынай няшчасця стала парушэнне правілаў паляванння. Той, хто загінуў, чамусьці пакінуў сваё месца, загадзя ўстаноўленае для палявання, і пайшоў, пры гэтым не паведаміўшы аб сваім перамяшчэнні кіраўніку і іншым удзельнікам мерапрыемства.

Гэта ўжо трэцяе здарэнне са смяротным зыходам за месяц ў рэгіёне. Першыя два адбыліся пры спробах незаконнага палявання.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ПАЎТОНЫ НА ПЛЯЧАХ

«Прагулка фермера»

Штогод у Мінску святкуецца Дзень горада. Традыцыйна ў праграме — спаборніцтвы асілкаў: яны буксіруюць МАЗ, выконваюць практыкаванні «Прагулка фермера», «Камень атласа»... Сярод дзясятка-паўтара асілкаў выступае і 33-гадовы двухметровы гігант Руслан Багіраў.

Толькі не трэба думаць, што Багіраў — прадстаўнік сонечнага Азербайджана. Руслан нарадзіўся на Брэстчыне, у Івацэвічах, пражывае ў вёсцы Дабромысль Івацэвіцкага раёна.

— Антрапаметрыяй ды неверагоднай сілай Руслан вельмі падобны да свайго дабромысленскага дзядулі Сяргея Субоцькі, які быў не дробнага целаскладу, — расказвае настаўнік фізкультуры Дабромысленскай СШ Аляксандр Сплендэр. — Любоў да сілавых і гульнявых відаў спорту, якасная вясковая ежа і генетыка зрабілі сваю справу. Уявіце, што мы Руслана бралі некалькі разоў на спаборніцтвы выступаць за сельсавет і... «трымалі ў запасе». Ну хто мог з ім сапернічаць у армрэслінгу, калі рука звычайнага мужчыны побач з яго рукой — рука дзіцячай лялькі, якую ён адламае ў адзін момант. Ведаю, што некаторыя яго сапернікі моцна пацярпелі, калі паспрабавалі перамагчы яго ў армрэслінгу...

...Больш за год таму Руслан, які займаўся цяжкімі сілавымі практыкаваннямі «для сябе», звярнуў увагу на аб'яву, што ў адным буйным беларускім горадзе будуць праводзіцца спаборніцтвы па сілавым экстрыме. Заявіўся, прыехаў — і адразу заняў другое месца, чым моцна збянтэжыў астатніх беларускіх стронгмэнаў. Ужо з першай спробы Руслан падчас практыкавання «Прагулка фермера» ўзяў два чамаданы вагой каля 170 кг кожны і пранёс некалькі дзясяткаў метраў. Стала ясна: у невялікім коле беларускіх сілавых экстрэмалаў з'явіўся моцны канкурэнт. Апетыт прыходзіць падчас яды: за апошні год Руслан прыняў удзел у добрым дзясятку падобных спаборніцтваў у Беларусі і Украіне, не аднойчы станавіўся прызёрам.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Алег ДАНЧАНКАЎ і яго ноша.

У выхадныя — «бервяно дрывасека»

Руслан Багіраў па прафесіі электразваршчык, працуе вахтавым метадам на будоўлі ў Мінску. Два тыдні працы ў сталіцы, дзе шчыльны працоўны графік, потым два тыдні ў асноўным у Дабромыслі. У роднай вёсцы, на ўчастку за гаспадарчымі пабудовамі, ён абсталяваў спартыўную пляцоўку пад адкрытым небам. Тут асноўныя спартыўныя снарады стронгмэна — велізарнае кола, якое кантуе Руслан, «каромысел» вагой каля паўтоны (яго на сваіх магутных плячах носіць па двары герой публікацыі), металічнае «бервяно дрывасека». Мы гутарым, Руслан размінаецца. Да нас падыходзіць баба Юлія:

— Калі ты, Руслан, будзеш на працы, я ўсё гэта жалеза здам, — з гумарам у голасе «пагражае» бабуля, якая жахаецца, назіраючы, як яе ўнук выціскае «бервяно дрывасека» ці падымае на плячах паўтонны «каромысел» і нясе па двары.

— Нічога дзіўнага! — кажа Руслан. — Калі б я п'яны спаў на лавачцы — ніхто не здзівіўся б з вяскоўцаў. А як убачаць, што кантую кола вагой у некалькі цэнтнераў, то круцяць пальцам ля скроні...

У тыя два тыдні, калі Руслан знаходзіцца на працы (на вахце), ён падтрымлівае спартыўную форму на працоўным месцы. Зварыў турнік, на ім падцягваецца. Падтрымліваць форму дапамагае яшчэ адно «асабістае» практыкаванне: ставіць свой «БМВ» на «ручнік», прывязвае канат і цягне машыну па дарозе. Але на працы ўсё ж такі галоўны «памочнік» — турнік. Дзіўна, але Руслан, вага якога каля 150 кг, падцягваецца некалькі дзясяткаў разоў. Асілкі, дарэчы, не любяць турнікоў: значную ўласную вагу вельмі няпроста падцягнуць да падбародка шмат разоў.

«Займаю шмат месца»

— Турнік люблю з дзяцінства. Рукі моцныя менавіта дзякуючы яму. Падчас спаборніцтваў «Буксіроўка грузавіка» падцягваю «МАЗ» сілай рук, хоць шмат хто з маіх сапернікаў больш працуюць нагамі і спінай, — кажа Руслан.

— Гэта, напэўна, не вельмі зручна — быць 2-метровым гігантам вагой каля 150 кг?

— Так... Калі заходжу ў вагон цягніка, то чую, як уздыхаюць суседзі па купэ — месца мне патрабуецца вельмі шмат. А ўявіце мяне на верхняй паліцы — я ж не памяшчаюся ні ў даўжыню, ні ў шырыню... Аддаю перавагу свайму аўто, салон якога таксама прыйшлося крыху перарабіць, бо не ўлезці. Калі на рабочай вахце ўваходжу ў кабінет інжынера, то ён мне прама кажа: калі ты, Руслан, заходзіш, мне няма чым дыхаць. З гэтым трэба неяк жыць.

— Сілавы экстрым — сур'ёзная рызыка для здароўя...

— Так, але і выдатная магчымасць праявіць сябе. Дарэчы, арганізатары любых падобных спаборніцтваў з разуменнем ставяцца і плацяць нават за ўдзел (за перамогу — асобная плата). На святах гарадоў гэта можа быць сума каля 2 мільёнаў (недзянамінаваных) рублёў — толькі, паўтаруся, за ўдзел.

— А якое харчаванне ў стронгмэна?

— Я ем тое, што і ўсе. Іншы дзень нічога, акрамя супу, не ем. Ем шмат каш, найперш аўсянку і грэчку.

У людзі... з гірай

На вуліцы Міру ў Дабромыслі, у пустым доме, які калісьці належаў роднаму дзеду, арганізаваў спартыўную залу вядомы на Брэстчыне гіравік Алег Данчанкаў. Сёння ў Алега няма роўных сапернікаў не толькі на раённым, але і на абласным узроўні... Звычайная яго трэніроўка — дзясяткі і сотні штурханняў і выцісканняў 24- і 32-кілаграмовых гір. Тоны металу паднімаюць яго дужыя рукі, каб павялічыць сілу і спрыт напярэдадні новых спаборніцтваў.

Для большасці мужчын і адзін раз выціснуць 32-кілаграмоўку — подзвіг, а тут Алег бярэ ў рукі дзве такія гіры (больш за палову ўласнай вагі) і штурхае іх дзясяткі разоў ўгору. «Спартыўная зала» Алега ў доме дзеда — гэта некалькі дзясяткаў гір, брусы, перакладзіна і шмат іншых прылад, зробленых уласнымі рукамі. Спаборніцтвы ідуць за спаборніцтвамі, і гіравіку Данчанкаву працаваць прыходзіцца вельмі шмат: за тыдзень — тры інтэнсіўныя трэніроўкі, дзве з іх сілавыя ў дзядулевай «спартзале», трэцяя — бег (знайсці сярод лясоў і лугоў «бегавую дарожку» няцяжка). Алег падкрэслівае: бег (4-5 км) абавязковы, гэта дазваляе «дыхалцы» працаваць без збояў...

...Алег з дзяцінства быў актыўным хлопцам, шмат часу праводзіў на спартыўных пляцоўках, разрываючыся паміж валейболам і сілавымі відамі. Як гіравік удзельнічаў толькі ў раённых спаборніцтвах (мясцовыя дажынкі, святы вёсак), нязменна перамагаючы. Гэта была ўмоўная «планка» Данчанкава, вышэй за якую ён асабліва і не хацеў падымацца. Але гадоў 8-10 таму тагачасны кіраўнік аддзела па спорце і турызме Івацэвіцкага райвыканкама Уладзімір Доўжык параіў Алегу выязджаць на спаборніцтвы гіравікоў вобласці, ды і краіны. Вось тады герой нашай публікацыі і задумаўся — ці не надышоў час больш прафесіянальна паставіцца да любімага занятку?

З той пары Алег прыняў удзел у некалькіх дзясятках турніраў рэспубліканскага маштабу (часцей за ўсё яны праходзяць у Мінску). Менавіта на такіх спаборніцтвах выканаў нарматывы, якія дазволілі атрымаць званне кандыдата ў майстры спорту. Верыць, што гэта не апошняя вышыня і што званне майстра спорту — не за гарамі.

— Спорт сцірае мяжу паміж вёскай і горадам, — разважае Алег. — Як гіравік я знайшоў шмат знаёмых і сяброў па ўсёй краіне. Дарэчы, дачку Алесю таксама накіраваў, так бы мовіць, у спартыўнае рэчышча: яна навучэнка Брэсцкага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву. Жыццё ў вёсцы нясумнае, калі жыць нясумна. Магчымасці для развіцця тут ёсць для кожнага — было б жаданне.

Аляксандр ГОРБАЧ.

■ Першы — пайшоў!

У «БЕЛАВІЯ» З'ЯВІЎСЯ САМЫ ТАННЫ РЭЙС

Нядаўна адкрыты падмаскоўны аэрапорт «Жукоўскі» прыняў першы рэгулярны пасажырскі рэйс. Ганаровае права прызямліцца ў ім атрымала «Белавія».



Летам паведамлялі, што першымі авіякампаніямі, якія прыме «Жукоўскі», могуць стаць кіргізская Air Kyrgyzstan або казахская SCAT. Чорна-аранжава-шэры «танкалёт» (так называюць Boeing 737-300, пафарбаваны ў фірменныя колеры камп'ютарнай гульні World of Tanks) са 143 пасажырамі на борце праехаў праз вадзяныя вароты (такі вільготны аналаг феерверка) і тым самым паклаў пачатак новым рэйсам з Мінска ў Маскву, якія будуць адбывацца штодзённа. Па панядзелках, серадах, пятніцах і суботах з вылетам у 8.15, у астатнія дні тыдня — у 18.05.

«Мы ведаем, што маскоўскае кіраўніцтва прыкладае шмат намаганняў для развіцця рэгіёнаў, надае асаблівую ўвагу іх інфраструктуры, транспарту. Нам прыемна, што сёння і беларусы далучыліся да гэтага працэсу», — адзначыў Томас Вайшвіла, генеральны дырэктар міжнароднага авіяцыйнага холдынга «РАМПАРТ АЭРА», які займаўся будаўніцтвам «Жукоўскага».

— Адкрыццё новага рэйса для любой авіякампаніі, у тым ліку і для «Белавія», — гэта заўсёды вялікая падзея. Ужо сёння мы сумесна з расійскімі калегамі з гэтага аэрапорта абмяркоўваем, як павялічыць колькасць палётаў з Мінска ў «Жукоўскі». Для нас рэгіён Маскоўскай вобласці вельмі важны. Мы вывучалі попыт і бачым, што цяпер ёсць патрэба ў перавозках не толькі з аэрапортаў Масквы ў Мінск і наадварот, — распавёў генеральны дырэктар «Белавія» Анатоль Гусараў.

Па яго словах, аэрапорт «Жукоўскі» стварыў нядрэнныя камерцыйныя ўмовы для беларускай авіякампаніі, прапанаваў спецыяльныя тарыфы на абслугоўванне. Менавіта гэта паўплывала на кошт квіткоў. Палёт новым рэйсам абыдзецца ў 34 еўра, прыблізна столькі ж каштуе квіток у плацкартны вагон з Мінска да Масквы, але розніца ў часе відавочная (самалётам — крыху больш за гадзіну, цягніком — ад 8,5 гадзіны). Што да коштаў на рэйсы «Белавіі» з Мінска ў аэрапорт Дамадзедава, то яны пачынаюцца з 55 еўра.

— Пасажыры могуць камфортна дабрацца з «Жукоўскага»да найбліжэйшай станцыі Маскоўскага метро «Кацельнікі» аўтобусамі-шатламі альбо на Казанскі вакзал з платформы «Адпачынак». Дарэчы, на ёй цяпер спыняюцца і хуткасныя цягнікі, якія дазваляюць даехаць да сталіцы ўсяго за сорак хвілін, — паведаміў міністр транспарту Маскоўскай вобласці Міхаіл Алейнік.

Намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнай карпарацыі «РасТэх» Дзмітрый Шугаеў паведаміў, што неўзабаве з «Жукоўскага» пачнуцца палёты па 23-х іншых напрамках, у тым ліку ў Еўропу. Таму для беларусаў новы аэрапорт можа стаць і перасадачным пунктам.

Першым пасажырам «Жукоўскага» стала беларуска, яна разам з дачкой ляцела да мужа, які знаходзіцца ў камандзіроўцы ў Маскве. Жанчына часта карыстаецца паслугамі «Белавіі», паколькі паветраны транспарт больш камфортны і хуткі за наземны.

— Калі набывалі квіткі, не звярнулі ўвагі на тое, што гэта першы рэйс у новы аэрапорт. Толькі ў небе даведаліся, што станем першымі пасажырамі «Жукоўскага». Нават не прадумалі, як ад яго даедзем да Масквы, — расказала Аляксандра.

Пасажыры рэйса з «Жукоўскага» ў Мінск таксама не засталіся ў баку ад знакавай падзеі: ім прапанавалі паспытаць святочны торт з эмблемамі новага расійскага аэрапорта і беларускай авіякампаніі.

Ганна КУРАК

Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

15 ВЕРАСНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15801)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Паэт Віталь РЫЖКОЎ:

«Літаратура — гэта шлях памылак»

«Думаю, класна, калі ты займаешся нейкай дзейнасцю больш як траціну жыцця, а цябе па-ранейшаму называюць маладым. Гэта як закансерваваная маладосць. І я не іранізую», — так распачаў нашу гутарку паэт Віталь РЫЖКОЎ. І хоць ён сам не прызнае сябе вядомым паэтам, дазволю сабе з гэтым не пагадзіцца. Яго дэбютная кніга «Дзверы, замкнёныя на ключы» разышлася двума тыражамі. Ён лаўрэат прэстыжнай прэміі «Дэбют», выдатны перакладчык прозы і паэзіі. Але пра любоў і прызнанне публікі лепш сведчаць поўныя залы на прэзентацыях і чытаннях, а таксама цытаты з яго вершаў, якія можна пабачыць на сценах у якасці графіці. Пра крытэрыі поспеху па-беларуску, парады паэтам-пачаткоўцам і стаўленне да маладога пакалення творцаў мы і гутарым сёння з Віталём Рыжковым.

— У нашай краіне словы пра поспех выклікаюць хутчэй іронію. Мы вельмі рэдка ставімся да творцаў з захапленнем — бо яны свае. Ды ён у суседнім дварэ жыве — які ён Боб Дылан? Нашых класікаў, якія не так даўно памерлі, — Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча — ведаем па двух-трох радках са школьнай праграмы. Дзейнічае адвечная формула: наш поспех тут — гэта наш поспех за межамі краіны. Калі па табе фанацеюць у Расіі, Польшчы, Украіне, тады праз гэты фільтр прыглядаюцца і ў нас. Вельмі часта поспех аказваецца мыльнай бурбалкай, якая нясе толькі праблемы. Таму я рады пазнаёміцца — непаспяховы, дагэтуль малады, можна лічыць пачатковец, Віталь Рыжкоў. І гэта вельмі здорава. Я хацеў бы, каб так было як мага даўжэй, каб можна было спакойна рабіць сваю справу і не марнаваць энергію на тое, каб адбівацца ад зайздроснікаў.

— Паэт сёння — гэта...

— Каб быць ім, мала проста займацца вершатворчасцю, у якой патэнцыйны чытач пазнае сябе, пляскае ў ладкі, чытаючы цытату ў сацыяльных сетках. Трэба здзіўляць. Калі і ёсць пазнаванне — дык пра нечаканае, пра што чалавек, можа быць, ніколі і не думаў. Да таго ж сённяшняму паэту варта няслаба разбірацца ў філасофіі і тэорыі літаратуры, каб здзіўляць не толькі чытача, але і калег.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

У страі з Зеўсам і Норай

Пра будні кінолагаў і іх выхаванцаў

У адным з аддаленых раёнаў Брэста знаходзіцца ўстанова з шыкоўным забеспячэннем выхаванцаў. У кожнага тут ёсць асабісты «кабінет», для харчавання — уласная кухня, дзе насельнікам распрацоўваюць сваю дыету, а іх фізічнае здароўе дапамагае падтрымліваць уласная трэніровачная пляцоўка... Трэба толькі ведаць, што выхаванцы тыя — чатырохногія. У гадавальніку службовых сабак Брэсцкага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС нясуць службу каля дваццаці «барбосаў», а працуе з імі цэлы шэраг спецыялістаў, сярод іх — маладыя інспектары-кінолагі: старшына Дзмітрый ЯРАШУК і прапаршчык Мікалай ЗАБАЛАТНЕЎ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мікалай Забалатнеў з Норай *(злева)* і Дзмітрый Ярашук з Зеўсам.

Энтузіязм і дзіцячая мара

— Сам я родам з Камянца, — пачынае аповед Дзмітрый. — Кінолагам, шчыра скажу, стаў нечакана для самога сябе. Пасля школы вучыўся ў Брэсцкім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы прыборабудавання, але па адукацыі адпрацаваў каля месяца — прыйшла павестка з ваенкамата. Служыў у Мінску і тады ж вырашыў, што па вяртанні пайду працаваць у міліцыю. У абласное ўпраўленне Дэпартамента аховы я прыйшоў на пасаду кіроўцы і часта пачаў перасякацца з кінолагамі. Гэта работа мяне зацікавіла, яна не такая манатонная, як круціць руль, ёсць творчыя моманты: кінолагі часта ўдзельнічаюць у розных спаборніцтвах, ездзяць у камандзіроўкі. Я папрасіў сяброў дапамагчы мне знайсці сабаку, і пачаў з ім працаваць. Лічыце, на голым энтузіязме, бо амаль нічога не ўмеў.

Пасля таго як Дзмітрый напісаў рапарт з просьбай аб пераводзе на пасаду інспектара-кінолага, яго накіравалі вучыцца. Спачатку на гадавальнік, дзе ён на працягу двух тыдняў асвойваў азы прафесіі, а потым на зборы ў вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы ў вёсцы Гарані пад Мінскам, дзе малады чалавек правёў чатыры месяцы. Дзмітрый і нямецкая аўчарка Зеўс разам рабілі поспехі і памыляліся.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Класныя навіны

СУБОТА Ў ШКОЛЬНЫМ РАСКЛАДЗЕ

Адпачываць, займацца спортам ці развівацца?

Як зрабіць школьную суботу любімым днём у дзятвы? Пошукі адказу на гэта пытанне цягнуцца вось ужо 15 гадоў. Усе намаганні кінутыя на тое, каб наведванне ўстановы адукацыі разглядалася не як абавязак, а стала альтэрнатывай бэссэнсоўнаму баўленню часу, дадатковай магчымасцю для самаразвіцця. А што думаюць пра школьную суботу самі вучні, іх бацькі і педагогі? Наколькі ахвотна яны далучаюцца да мерапрыемстваў па суботах? Высветліць гэта паспрабавалі падчас маніторынгу арганізацыі шостага школьнага дня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Даследаваннем, што праводзілася Нацыянальным інстытутам адукацыі па даручэнні Міністэрства адукацыі, былі ахоплены вучні пятых і восьмых класаў 30 устаноў адукацыі, размешчаных у розных рэгіёнах краіны, а таксама бацькі вучняў і педагогі.

ХРАНІЧНАЯ ЗАНЯТАСЦЬ БАЦЬКОЎ

На думку 92 працэнтаў педагогаў, пры арганізацыі шостага школьнага дня ў першую чаргу ўлічваюцца інтарэсы і запатрабаванні вучняў і іх бацькоў. Аднак гэтую думку падзяляюць толькі 57 працэнтаў вучняў і прыкладна палова бацькоў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
15 09 2016 г.

Смачна есці!

«ШВЕДСКІ СТОЛ» ДЛЯ ВУЧНЯ

А таксама арганізацыя экспрэс-сняданкаў, меню свабоднага выбару, харчаванне па меню папярэдняга заказу «сёння на заўтра» — гэтыя і іншыя формы абслугоўвання выкарыстоўваюцца цяпер ва ўстановах адукацыі з мэтай паляпшэння якасці харчавання навучэнцаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Згодна з аператыўнай інфармацыяй у краіне налічваецца 2959 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх вучацца 937,5 тысячы навучэнцаў. Харчаванне школьнікаў забяспечваюць 3,5 тысячы аб'ектаў грамадскага харчавання (кавярні, сталовыя, буфеты, кафетэрыі) на 317 тысяч месцаў. Для больш поўнага задавальнення попыту навучэнцаў пры навучальных установах працуе больш як 140 кавярняў, бараў і 8 крам і аддзелаў кулінарыі. Сёлета напярэдадні новага навучальнага года праведзены капітальныя рамонты ў 13 аб'ектах грамадскага харчавання пры школах. Касметычны рамонт сталовых і абедзенных зал зроблены практычна ва ўсіх агульнаадукацыйных і іншых навучальных установах.

Суб'ектамі грамадскага харчавання, уключаючы спажывецкую кааперацыю, арганізавана харчаванне ў 41% школ, у якіх навучаецца каля 60% усіх школьнікаў. У 59% школ яно арганізуецца ўстановамі адукацыі. У гарадах краіны створаны 32 камбінаты школьнага і студэнцкага харчавання, якія служаць базавымі арганізацыямі для забеспячэння сталовых, буфетаў паўфабрыкатамі, кулінарнымі, булачнымі і мучнымі кандытарскімі вырабамі і іншымі таварамі.

Навучэнцы, для якіх не прадугледжана харчаванне за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, забяспечваюцца ім за кошт бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў па меню свабоднага выбару. Каб пашырыць асартымент прадукцыі для навучэнцаў, у школах паўсюдна арганізавана работа буфетаў за наяўны разлік.

Вучням прапануецца гарачае харчаванне ў адпаведнасці з прыкладнымі двухтыднёвымі рацыёнамі, якія распрацоўваюцца з улікам фізіялагічных патрэб і зацверджаных нормаў харчавання, дыферэнцаваных па ўзросце навучэнцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Кампус

Хто самы актыўны ў сацсетках?

Рэспубліканскі конкурс на самую лепшую групу ў сацыяльных сетках сярод устаноў вышэйшай адукацыі абвясціла Міністэрства адукацыі.

У конкурсе змогуць прыняць удзел афіцыйныя старонкі (групы) устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваныя ў сацыяльных сетках.

Яны будуць ацэньвацца па наступных крытэрыях: афармленне (дызайн), рэгулярнасць абнаўлення старонкі, колькасць удзельнікаў, уцягнутасць аўдыторыі (колькасць лайкаў, каментарыяў, перапостаў), унікальнасць і цікавасць зместу, суадносіны знешняга і ўласнага кантэнту, этычнасць ва ўзаемадзеянні з удзельнікамі, нестандартныя і інавацыйныя падыходы да прыцягнення і ўтрымання цікавасці аўдыторыі і іншых.

Пераможцы конкурсу будуць выбраны на падставе вынікаў галасавання за канкурсантаў, арганізаванага на старонцы ўпраўлення па справах моладзі ў Facebook і групе «ВКонтакте», а таксама на падставе меркаванняў членаў журы конкурсу, у якое ўвойдуць прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, грамадскіх аб'яднанняў і сродкаў масавай інфармацыі.

Мэта конкурсу — развіццё адзінай маладзёжнай інфармацыйнай прасторы і папулярызацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў інтэрнэце.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

СУБОТА Ў ШКОЛЬНЫМ РАСКЛАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

66 працэнтаў апытаных педагогаў лічаць, што ва ўстановах адукацыі з бацькамі наладжана цеснае ўзаемадзеянне па пытаннях арганізацыі шостага школьнага дня. Разам з тым падчас маніторынгу было ўстаноўлена, што колькасць бацькоў, якія прымалі ўдзел у арганізацыі і правядзенні шостага школьнага дня, знізілася ў параўнанні з 2010 годам на 17 працэнтаў. Большая палова бацькоў (54 працэнты) адказалі, што яны не ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні шостага школьнага дня. **У якасці прычыны бацькі часцей за ўсё згадвалі адсутнасць вольнага часу — 79 працэнтаў, што практычна ў два разы больш, чым пяць гадоў таму.** Таксама павялічылася колькасць бацькоў, якія лічаць, што «арганізацыя і правядзенне шостага школьнага дня — гэта функцыя ўстановы адукацыі» (амаль 30 працэнтаў). Прыкладна 10 працэнтаў апытаных паведамілі, што іх «ніхто не запрашае паўдзельнічаць» і спасылаліся на адсутнасць інфармацыі аб запланаваных мерапрыемствах.

Асноўнымі крыніцамі такой інфармацыі для навучэнцаў па-ранейшаму з'яўляюцца класны кіраўнік (на гэта ўказалі больш як 90 працэнтаў навучэнцаў) і інфармацыйныя стэнды ў школе (65 працэнтаў вучняў). Каля 40 працэнтаў апытаных адказалі, што яны даведваюцца аб мерапрыемствах шостага школьнага дня ад сваіх аднакласнікаў і крыху меншая колькасць — на сайце ўстановы адукацыі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

37 працэнтаў бацькоў перакананы, што суботу дзецям лепш за ўсё праводзіць дома, у сям'і.

Бацькі, у сваю чаргу, атрымліваюць інфармацыю ад сваіх дзяцей або ад класнага кіраўніка. У поўнай меры інфармаваны аб планах выхаваўчай работы на шосты школьны дзень 51 працэнт бацькоў; аб раскладзе факультатыўных заняткаў, гурткоў, секцый і клубаў — амаль 62 працэнты; аб графіку працы педагога-псіхолага, сацыяльнага педагога, бібліятэкі, камп'ютарнага класа, спартыўнай залы — 44,6 працэнта апытаных бацькоў.

ДАЙЦЕ ВЫСПАЦЦА!

Высветлілася, што большасць вучняў (ад 76 да 80 працэнтаў) па суботах наведваюць мерапрыемствы, якія праводзяцца ў школах. Іх прывабліваe магчымасць даведацца пра нешта цікавае, навучыцца чамусьці карыснаму, паўдзельнічаць у розных гульнях і спаборніцтвах. Для меншай часткі апытаных матыватарам з'яўляюцца таксама стасункі з аднакласнікамі, сябрамі, магчымасць паўдзельнічаць у карысных акцыях, заняцца любімай справай, адчуць сябе паспяховым, знайсці прымяненне сваім здольнасцям. Такія адказы навучэнцы пятых класаў давалі часцей, чым васьмікласнікі.

Адзін з самых важных індыкатараў — доброахвотнасць наведвання школы ў суботу. Пераважная большасць вучняў (ад 80 да 86 працэнтаў) адказалі, што яны робяць гэта па ўласным жаданні. Большасць апытаных адказалі, што праводзяць ва ўстанове адукацыі ў шосты школьны дзень ад дзвюх да трох гадзін.

Цікава было даведацца, а па якіх прычынах школьнікі ігнаруюць суботнія мерапрыемствы? «Стамляюся на працягу вучэбнага тыдня і высыпаюся» — так адказалі 13,9 працэнта пяцікласнікаў і 19,7 працэнта васьмікласнікаў. Неабходна адзначыць, што ў параўнанні з 2010 годам колькасць такіх адказаў знізілася ў 2,5 раза.

Каторыя паведамлялі, што аддаюць перавагу баўленню вольнага часу дома, альбо ўказвалі, што «ўстанова адукацыі размешчана далёка» (прыкладна 6—8 працэнтаў). І толькі зусім нязначная колькасць апытаных (каля 3 працэнтаў) адзначылі, што школьныя мерапрыемствы ім проста нецікавыя.

Часцей за ўсё па суботах дзеці наведваюць спартыўныя мерапрыемствы, інтэлектуальныя гульні, віктарыны, музеі, тэатры, выстаўкі, удзельнічаюць у працоўных акцыях (гэтыя варыянты адказаў адзначыла большасць апытаных). Найбольш папулярныя ў вучняў у шосты школьны дзень спартыўныя секцыі, спартыўна-тэхнічныя гурткі, гурткі мастацкай творчасці, мастацкай самадзейнасці і працоўнай накіраванасці. Многія навучэнцы з'яўляюцца членамі школьных камандаў па якім-небудзь відзе спорту альбо членамі груп падтрымкі (чарлідараў) на спартыўных спаборніцтвах.

У рамках прафарыентацыйнай працы са школьнікамі часцей за ўсё ў шосты дзень праводзяцца экскурсіі на прадпрыемствы, сустрэчы з прадстаўнікамі розных прафесій, кансультацыі па выбары прафесіі, тэсціраванне прафесійных схільнасцяў і намераў навучэнцаў і факультатыўныя заняткі прафарыентацыйнай накіраванасці.

Параўнальны аналіз вынікаў, атрыманых у 2010-м і 2015-м гадах, паказаў, што колькасць васьмікласнікаў, якія прымалі ўдзел у экскурсіях на прадпрыемствы і сустрэчах з прадстаўнікамі розных прафесій, практычна не змянілася. Пры гэтым паказчык наведвання факультатыўных заняткаў прафарыентацыйнай накіраванасці павялічыўся практычна ў 10 разоў.

ВЫХАВАЎЧЫ ЭФЕКТ

Важным паказчыкам эфектыўнасці шостага школьнага дня з'яўляецца задаволенасць навучэнцаў і іх бацькоў. Падчас даследавання высокія ацэнкі далі больш як 80 працэнтаў пяцікласнікаў і амаль 76 працэнтаў васьмікласнікаў.

Высветлілася таксама, што большасць бацькоў задаволены планаваннем і арганізацыяй шостага школьнага дня, зместам выхаваўчых мерапрыемстваў, пералікам гурткоў, секцый і факультатыўных заняткаў. Узаемадзеянне ўстановы адукацыі і сям'і пры арганізацыі і правядзенні шостага школьнага дня задавальняе каля 60 працэнтаў бацькоў.

Для ацэнкі эфектыўнасці школьнай суботы ў рэспандэнтаў пацікавіліся, у якой меры наведванне прапанаваных мерапрыемстваў спрыяе іх адпачынку і фізічнаму развіццю, павышэнню цікавасці да вучобы, набыццю працоўных навыкаў і рэалізацыі іх здольнасцяў. Як і ў папярэднім даследаванні, **больш крытычна ацэньваюць эфектыўнасць мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў шосты школьны дзень, бацькі навучэнцаў,** а васьмікласнікі больш стрыманыя ў сваіх ацэнках у параўнанні з пяцікласнікамі.

Лічаць, што такія мерапрыемствы ў поўнай меры дапамагаюць навучэнцам адпачыць і аднавіць сілы, 67 працэнтаў вучняў пятых класаў і 43 працэнты іх бацькоў. Сярод васьмікласнікаў — 48 і 37 працэнтаў адпаведна.

З тым, што ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца ў шосты школьны дзень, у поўнай ступені дазваляе ўмацаваць здароўе навучэнцаў, развівацца фізічна, рэалізаваць здольнасці, пагадзіліся прыкладна 77 працэнтаў пяцікласнікаў, ад 64 да 67 працэнтаў васьмікласнікаў і ў сярэднім 53 працэнты бацькоў навучэнцаў. Пераважная большасць апытаных школьнікаў адказалі, што наведванне суботніх мерапрыемстваў дапамагае ім навучыцца карыснай справе. Каля паловы апытаных бацькоў таксама адзначылі адчувальны эфект працоўнага выхавання ў шосты школьны дзень.

Яшчэ адзін важны паказчык — павышэнне цікавасці да вучобы. Лічаць, што мерапрыемствы шостага школьнага дня цалкам рэалізуюць гэтую задачу, прыкладна 73 працэнты пяцікласнікаў і 57 працэнтаў васьмікласнікаў. З бацькоў такую думку падзяляюць 36 працэнтаў апытаных.

НЕ ХОЧАМ ЦІ НЕ МОЖАМ?

У якасці фактараў, якія ў першую чаргу перашкаджаюць эфектыўнай арганізацыі шостага школьнага дня, педагогі адзначылі недастатковае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне (амаль 54 працэнты адказаў) і нізкую зацікаўленасць бацькоў навучэнцаў (46 працэнтаў).

Каля 37 працэнтаў апытаных педагогаў у якасці асноўнай перашкоды ў арганізацыі шостага школьнага дня адзначылі неразвітую інфраструктуру для баўлення вольнага часу ў раёне, дзе размешчана ўстанова адукацыі (адсутнасць бібліятэк, тэатраў, музеяў); у сельскіх установах адукацыі гэты паказчык вышэйшы, чым у гарадскіх, на 18 працэнтаў. Адсутнасць у навучэнцаў жадання ўдзельнічаць у прапанаваных мерапрыемствах канстатавалі каля 40 працэнтаў педагогаў у гарадскіх установах адукацыі і прыкладна 27 працэнтаў — у сельскіх.

Сур'ёзнай перашкодай у сельскіх установах адукацыі застаецца арганізацыя падвозу навучэнцаў ва ўстанову адукацыі ў шосты школьны дзень. На гэта ўказалі 49 працэнтаў педагогаў сельскіх устаноў адукацыі.

На пытанне пра тое, якім бы быў найлепшы варыянт арганізацыі шостага школьнага дня, навучэнцы часцей за ўсё адказвалі, што ў гэты дзень лепш за ўсё праводзіць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі мерапрыемствы выхаваўчай накіраванасці (каля 80 працэнтаў адказаў), арганізоўваць працу гуртковай і секцыйнай (каля 60 працэнтаў). У гэтым іх падтрымліваюць бацькі. Разам з тым 37 працэнтаў бацькоў перакананы, што суботу дзецям лепш за ўсё праводзіць дома, у сям'і. З гэтым згодны і педагогі, якія часцей за ўсё выбіралі такі варыянт адказу (35,5 працэнта).

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

На сваім месцы

У РАЁНЕ — ПЕРШЫ КАМБАЙНЕР!

ТАМУ ШТО ВАСІЛЬ АРЛОЎ НЕ ЎМЕЕ ХАЛТУРЫЦЬ

Да жняркі камбайна прычапіліся сцябліны збажыны. Відаць, што тэхніка толькі-толькі вярнулася з поля і неўзабаве адправіцца туды ж. Побач з машынай завіхаўся камбайнер, наладжваў механізм. У сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Ломашы Агра», што ў Глыбоцкім раёне, уборка на момант нашага прыезду ўжо заканчвалася. Вось Васіль Арлоў разам з іншымі працаўнікамі і рупіўся ўбраць апошнія лапікі збажыны. Ды і не прывык хлопец працаваць напаўсілы.

Аграгарадок Ломашы знаходзіцца недалёка ад Полацка, таму і рабочыя рукі размяркоўваюцца паміж сельскай гаспадаркай на месцы і працай на заводах у горадзе. Сям'я Арловых выбрала работу на зямлі. Тэхніка, машыны падабаліся Васілю з маленства, за механізатарамі хадзіў «хвастом», глядзеў, як тыя ўпраўляліся з рамонтам, наладкай. Каля акна чакаў прыезду бацькі. Мікалай Арлоў працаваў трактарыстам і часам браў сына да сябе ў кабіну «пакатацца». Паступова хлопец заслужыў давер. Самастойна разабраць той жа рухавік ад трактара, вядома, яму ніхто не давяраў, але пастаяць побач, падаць дэталь, пасядзець за рулём знаходзілася магчымасць, таму пра сваю будучую прафесію Васіль ведаў з дзяцінства. Пасля школы паступіў у Полацкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці. На практыку маладога механізатара адправілі ў родныя мясціны.

У сямнаццаць гадоў Васіль адбыў свой першы сезон на камбайне, праўда, не кіроўцам, а памочнікам. Свой лёс ён таксама сустрэў у той год. Алена Заяц, будучая настаўніца малодшых класаў, таксама праходзіла ў Ломашах практыку, і маладыя людзі ўпадабалі адно аднаго.

Практыка, як і вучоба, скончыліся, а Васіль і Алена засталіся ў аграгарадку. Жонка стала вучыць дзетак у Ломашаўскім дзіцячым садзе — сярэдняй школе, а малады механізатар напачатку, як і бацька, працаваў на трактары. Справа, як той казаў, пайшла. З 2008 года ў раённых спаборніцтвах маладых механізатараў, задзейнічаных у пасяўных кампаніях, хлопец амаль кожны год выходзіў у тройку пераможцаў. Хутка кіраўніцтва гаспадаркі даверыла работніку-энтузіясту камбайн. Як аказалася, недарма. Цяпер да ўзнагарод Васіля дадаліся поспехі ў жніве. Тры гады ён прадстаўляў раён на абласным конкурсе майстэрства «Найлепшы па прафесіі» сярод маладых механізатараў, кожны год удзельнічаў у раённых спаборніцтвах маладых уборачных экіпажаў і вадзіцеляў, занятых на адвозе збожжа. Сёлета Васіль стаў першым у раёне маладым камбайнерам, які намалаціў 500 тон збожжа. Потым былі 600 тон, 700... За ўборачную ніхто так і не змог абагнаць працаўніка з Ломашаў. Нядзіўна, што абласны камітэт прафсаюза ўзнагародзіў перадавіка падзякай за плённыя вынікі ўборачнай кампаніі. Дырэктар «Ломашы Агра» Аляксандр Навіцкі таксама задаволены падначаленым:

— Яго на якую працу не прызначыш — усё будзе зроблена. Што на камбайне, што на мехдвары, што на трактары — работу выканае і не схалтурыць. Раней у нас прыказка была: «Імкніцеся за старэйшымі!» А цяпер правільна будзе казаць: «Імкніцеся за малодшымі!» Старэйшае пакаленне, бывае, у цяньку хоча пасядзець, а моладзь матываваная, бо за добрай працай і павага, і прызнанне заслуг, і матэрыяльная забяспечанасць, што для маладых сем'яў немалаважна.

Імкнуцца да высокіх паказчыкаў сапраўды ёсць стымул: пакуль жніво, механізатар атрымлівае самы высокі заробак за год, 600—1400 рублёў. Затое і працаваць, пакуль гарачая пара, даводзіцца з 7 раніцы да 9—10 вечара. Выхадных няма, людзі шчыруюць нават у нядзелю. Адпачынак толькі на час абеду, калі з гаспадаркі прывозяць падсілкавацца гарачым. За дзень на полі можна зжаць 10—15 гектараў. Усё залежыць ад урадлівасці: чым яна большая, тым марудней ідзе тэхніка. Зрэшты, камбайнер слаўны не праходам тэхнікі, а намалотам. Так, Васіль аднойчы паспеў да вечара намалаціць 70 тон збожжа. Як аказалася, выдатнікам жніва больш урадлівыя палі і самую добрую тэхніку не выдзяляюць. Перадавікі спаборніцтва выйграюць здольнасцю планаваць і ўменнем не спяшацца ў важным: лепш раніцай патраціць час на наладку тэхнікі, чым губляць каштоўныя гадзіны на полі.

...Калі выпадае вольны час, хлопец любіць пасядзець з вудай на беразе, паблукаць са стрэльбаю па лесе, і, вядома ж, пабыць разам з жонкай і двума сынамі. З'ездзіць куды-небудзь на адпачынак пакуль не выходзіць: трэба займацца домам. Жыллё маладой сям'і выдзеліла гаспадарка, але хочацца ўладкаваць усё на свой густ, купіць добрую мэблю, збудаваць летні дамок. Пра далёкую будучыню 27-гадовы Васіль пакуль не загадвае, гаворыць, што «час пакажа».

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by
Мінск — Глыбоцкі раён — Мінск.

ПАГУЛЯЦЬ У «ЗОРКУ»

У чым заключаецца галоўная небяспека для маладога пакалення? Нехта дагэтуль старамодна думае, што жыццё новай генерацыі можа сапсаваць камп'ютар: маўляў, з дому падлеткі не выходзяць, садзяць зрок, горбяць спіны... Многіх найперш палохаюць відэагульні: адны быццам бы выхоўваюць жорсткасць, другія, як тая ж Pockemon Go, небяспечныя самі па сабе.
Маё ж шчырае перакананне ў тым, што самую вялікую небяспеку для маладых (не здзіўляйцеся тое пачуць ад прадстаўніка гэтага самага пакалення) уяўляюць сацыяльныя сеткі. І я кажу не пра фарміраванне залежнасці, размовы пра якую ўжо набілі аскому, а зусім пра іншы аспект. У адным з мінулых матэрыялаў рубрыкі я пахваліў іх. Размова ішла пра тысячы разнастайных тэматычных паблікаў, якія аб'ядноўваюць людзей, зацікаўленых нейкай тэмай.
Якія, здавалася б, прэтэнзіі?

Але калі глядзець на рэчы аб'ектыўна, то большасць стужак навін карыстальнікаў складаецца зусім не з такой карыснай інфармацыі. Адкрыйце сваю і прыгледзьцеся — якіх матэрыялаў там найбольш? Пераважаць будзе так званы «карыстальніцкі» кантэнт, тое, для чаго некалі і ствараліся сайты кшталту Facebook і «УКантакце». Вось школьная сяброўка з'ездзіла на мора, выклала пад паўсотні здымкаў: на пляжы ў розных позах, у кавярнях, у гатэлі... Аднакурсніца збіраецца на вечарынку: не забыла сфатаграфаваць сябе ў люстэрку, маўляў, паглядзіце ўсе, якая я прыгожая. Яшчэ адна знаёмая выклала шматзначную псеўдафіласофскую цытату і далучыла аўдыязапіс — узвышаная натура! Сусед набыў новую машыну і не можа спыніцца фатаграфавацца на яе фоне.

І справа не ў тым, што людзі марнуюць уласны час на спажыванне такой другаснай інфармацыі. Значна большая праблема заключаецца ў тым, што многія спрабуюць стварыць вобразы людзей, якімі яны насамрэч не з'яўляюцца. Сеціва дало нам магчымасць адчуць сябе тымі, пра каго гадоў 20 таму можна было прачытаць толькі ў свецкай хроніцы. Дзяўчына на моры — гэта, відавочна, фотамадэль, якая круглы год толькі і здымаецца для глянцавых часопісаў, ездзіць па курортах і адпачывае. Тая, што ідзе на вечарынку, — безумоўна, свецкая львіца, «каралева дыскатэк». «Філасофская» дзяўчына — чулая паэтка ці музыкант, творчая і публічная асоба. Хлопец з машынай — паспяховы бізнесмен, які ўвесь час займаецца сваёй справай і без машыны яму — ніяк...

Мой сябар неяк даўно пазнаёміўся ў адной з сацсетак з дзяўчынай. Мяркуючы па фота і запісах — прыгажуня, увесь час ездзіць у падарожжы, чытае кнігі і займаецца спортам. Прыяцеля так зачапіла гэта асоба, што ён месца сабе не мог знайсці. Праз пару месяцаў начных перапісак і дзённых пакут наважыўся ёй патэлефанаваць. Пытаюся: «Ну што скажаш?» — «Ведаеш, неяк мне яе голас не спадабаўся. Уяўляў яго не такім». Сябра як у ваду глядзеў. Праз некаторы час усё раскрылася: дзяўчына аказалася простай студэнткай-лежабокай, карысталася чужымі здымкамі, а свае натхнёныя запісы і думкі пра кнігі брала з інтэрнэту. А калі б усё зайшло далей?

Галоўная ж небяспека нават не ў такіх сітуацыях. У любым выпадку з цягам часу ўсё становіцца на свае месцы. Як мінімум на прыступках ЗАГСа (ці пасля яго) сябар убачыў бы, што гэта не зусім той чалавек, у якога ён закахаўся дыстанцыйна. Горш за ўсё тым, хто не зразумеў правілаў гульні і паводзіць сябе ў сеціве гэтак жа, як у рэальным жыцці. Такому чалавеку давядзецца цяжка: назіраць, як твае аднагодкі «дабіваюцца» поспеху, жывуць прыгожа і без праблем, калі ў цябе ўсё банальна і проста — што можа быць складаней? Пры такім развіцці спраў можна ўпэўніць сябе ў тым, што ты няздольны, слабак... І, самае страшнае, я ведаю нямала такіх людзей. Якія шчыра ўпэўнены, што ўсе навокал ужо ўсяго дасягнулі, а яны самі плятуцца «ў хвасце».

...І хто даведаецца, што насамрэч фота з курорту зроблены за адзін дзень — праездам, а машына стаіць у гаражы без паліва? Што на дыскатэцы «тусоўшчыца» ўвесь вечар прасядзела адна, а аматарка прыгожых цытат за ўсё жыццё ледзь-ледзь адолела тры кніжкі?..

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
БРСМ
ЧЫРВОНКА

Падарылі ўсмешку дзяўчынцы

«Прыязджайце, вельмі патрэбны валанцёры, каб падняць настрой адной дзяўчынцы». З такой просьбай да кіраўніка валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» пярвічкі БРСМ Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Крысціны Брагінец звярнуўся псіхолаг Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах. З ім валанцёрскі атрад ВНУ «Мы — дзецям» супрацоўнічае ўжо некалькі гадоў.

— Цэлымі днямі дзяўчынка здавала аналізы, хадзіла па ўрачах, а вольны час праводзіла ў адзіноце. У нейкі момант яна папрасіла псіхолага, каб тая пазнаёміла яе з новымі сябрамі, — расказвае Крысціна Брагінец. — Ужо ранкам наступнага дня маленькая пацыентка цэнтра дзіцячай анкалогіі пазнаёмілася з адной з нашых актыўных валанцёрак — Крысцінай Давыдзенкавай. Агульная мова была знойдзена вельмі хутка. Высветлілася, што дзяўчынка вельмі любіць чытаць, асабліва казкі. Праз некалькі гадзін дзяўчынка пазнаёмілася з валанцёркай Вікай Ваўчок. Ёй пацыентка распавяла, што, апроч іншага, займаецца музыкай і ўмее іграць на цымбалах. Ранкам наступнага дня ў цэнтр завітала ўжо Вольга Данілюк. З ёй дзяўчынка падзялілася, як бы яна размалявала сцены будынка, каб было весялей бавіць тут час. Калі да дачкі якраз у гэты момант прыехаў бацька, ён з задавальненнем адзначыў актыўнасць і змену ў настроі дзяўчынкі. Як жа прыемна ўсведамляць, што ты можаш дапамагчы іншаму. Паспрабуйце, і ўдзячная ўсмешка надасць вам новых сіл зноў і зноў рабіць добрыя справы!

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Запрашальнік

СЯБРОЎСТВА ЛІТАРАТАРАЎ БЕЗ МЕЖАЎ

Публікацыя твора на беларускай і рускай мовах у альманаху, што распаўсюджваецца ў Беларусі і Расіі. Магчымасць праверыць свае сілы ў прозе і знайсці ўласнага чытача. А яшчэ — шанц пазнаёміцца з вядомымі літаратарамі, крытыкамі і наладзіць стасункі са сваімі калегамі па пяры. Усё гэта толькі некаторыя з «бонусаў», што атрымаюць пераможцы конкурсу маладых літаратараў «Мост Дружбы» (па пяць з Беларусі і Расіі).

У якасці яго заснавальніка выступае Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы, а падтрымку ў арганізацыі аказваюць асацыяцыя «Пазнаём Еўразію», Інстытут сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага і Нацыянальны прэс-цэнтр Беларусі.

— Падрастае новае пакаленне маладых людзей, якія спрабуюць сябе ў літаратуры. Магчыма, у найбліжэйшай будучыні нехта з іх стане вядомым і заваюе сваёй творчасцю вялікую колькасць чытачоў, — распавядае адзін з каардынатараў конкурсу, **намеснік дырэктара Нацыянальнага прэс-цэнтра Аляксей ЦЫБУЛЬКА.** — Менавіта на пошук таленавітых аўтараў і скіраваны наш конкурс маладых літаратараў «Мост Дружбы», які праводзіцца сёлета вось ужо трэці раз. Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы вызначыў перыядычнасць правядзення конкурсу — раз на два гады. Прыемна адзначыць, што з кожным годам цікавасць да яго з боку маладых аўтараў расце.

На адрас конкурсу «Мост Дружбы» ўжо паступіла каля 60 заявак ад беларускіх і расійскіх літаратараў, але прыняць удзел у ім яшчэ не позна.

Падаць свае работы запрашаюць маладых беларускіх і расійскіх аўтараў ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў. Каардынатары прымаюць толькі празаічныя творы малой літаратурнай формы (апавяданне, нарыс, эсэ) на беларускай ці рускай мовах, якія раней не друкаваліся і не ўдзельнічалі ў іншых конкурсах.

Работы і заяўкі (з указаннем імя, прозвішча аўтара, яго ўзросту, месца жыхарства, вучобы ці працы, кантактных звестак, таксама з далучэннем фотаздымка і кароткай біяграфіі) прымаюцца да 30 верасня ўключна па электронным адрасе info@bpc.by з пазнакай «Мост Дружбы».

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 09 2016 г.

Вусатыя–паласатыя

ФЛЮІДЫ ДАБРЫНІ ДЛЯ ТЫХ, КАГО ПРЫРУЧЫЛІ

Фатограф-аніматаліст і валанцёрка дабрачыннага аб'яднання «ЗААшанц» Аляксандра ПЯХОТА дапамагла знайсці дом дзясяткам кошак і сабак і нават арганізавала ўласную выставу. «Падарожжа дадому» — гэта цыкл фотаздымкаў, прысвечаных жыццю бяздомных жывёл. «Чырвонка. Чырвоная змена» пагаварыла з чалавекам, які неабыякавы да лёсаў братоў нашых меншых.

— Чаму вырашыла займацца валанцёрствам?

— Неяк я была на вулічных здымках і ўбачыла жанчыну з сабакам. Часта гавораць пра падабенства паміж гаспадаром і гадаванцам — у гэтым выпадку яно было бясспрэчным. На асацыятыўным узроўні адчула іх знешняе і ўнутранае адзінства. Мяне адразу пацягнула да іх, захацелася пазнаёміцца бліжэй. Праз пэўны час я ўжо ведала, што мая суразмоўца вельмі любіць свойскіх жывёл і гэтага сабаку выратавала, даведаўшыся пра грубае абыходжанне з ім папярэдніх гаспадароў. Ад «парачкі» зыходзілі флюіды дабрыні, што і натхніла мяне заняцца валанцёрствам.

— Але пачала ты не адразу...

— Так, у мітусні будняў страціла долю цікавасці да гэтай праблемы. Але лёс зноў падкінуў шанц. Я шукала ката па просьбе знаёмай і наткнулася на групу «УКантакце» «Дапамога бяздомным жывёлам». І тут убачыла незлічоную колькасць коцікаў і сабачак, якія засталіся без даху і ежы, тое, у якім яны жудасным фізічным стане...

— А сама трымаеш свойскіх жывёл?

— У мяне тры кошкі. У Мілы атрафіравана задняя частка тулава, яна не ходзіць... Трапіла да мяне выпадкова. У маёй знаёмай неяк збег кот, і я вызвалася дапамагчы ў пошуках. Неўзабаве да нас падышоў мужчына і прамовіў: «Здарова кагалам шукаеце, а ці возьмеце хворага?» Ён расказаў нам, што падабраў кошку на вуліцы і доўгі час выходжваў яе, але працягваць ужо не можа: няма ні грошай, ні часу. Крыху пазней я звязалася з ім і забрала небараку. Вазіла Мілу да найлепшых ветэрынарных лекараў, але прагноз быў адзін — усыпляць. Гэтага я зрабіць не магла, таму стала вывучаць інфармацыю ў інтэрнэце, рабіла масаж, забяспечыла спакой хворай. І ўжо назіраецца пэўны прагрэс: у яе з'явіўся апетыт, ёсць кантакт пры дотыку. Лекары гавораць, што гэта проста рэфлексы і яна па-ранейшаму ў цяжкім стане, але мне хочацца верыць у лепшае.

— Якія асаблівасці трэба ўлічваць пры здымках жывёл?

— Фатаграфаванне — апошняя прыступка на шляху да ўладкавання кацяняці ў сям'ю. Перад тым валанцёры дэзынфіцыруюць, стэрылізуюць жывёлу і толькі потым аддаюць у рукі фатографу. Мая задача — паказаць характар «мадэлі», яе ўнікальнасць. І часам прыходзіцца вельмі цяжка, бо кошкі, у адрозненне ад тых жа сабак, ганарлівыя і свавольныя. Яны не будуць падладжвацца пад вас, калі ім гэта нецікава. Першыя некалькі хвілін назіраю. Я не стаўлю «мадэль» у пэўную позу, каб сфатаграфаваць. Толькі дапамагаю ёй раскрыцца, «паказаць» сябе.

— А як спраўляешся з эмоцыямі?

— Першы час было вельмі цяжка. Хацелася паціскаць «мадэль», пагуляць з ёй. Часта слёзы наварочваліся ад аднаго толькі позірку жывёлы. Заўсёды змагаюся з жаданнем забраць іх усіх сабе *(смяецца)*. Але потым бярэш сябе ў рукі і здымаеш.



— Так, партфоліа ёсць, што далей?

— Шукаем гаспадароў. Гэта самы адказны момант, бо ад яго залежыць уся наша справа. Фотаздымкі выкладваюцца на сайце «ЗААшанц». З патэнцыяльнымі гаспадарамі праводзіцца псіхалагічная гутарка. Мы аглядаем памяшканне, дзе жыве чалавек, пытаемся пра заробак, узрост дзяцей, наяўнасць працоўных камандзіровак і інш. Калі заўважаем, што кліентам рухаюць эгаістычныя мэты, то адразу адмаўляем.

— Нядаўна прайшла твая выстаўка «Падарожжа дадому». Раскажы пра яе.

— Я хацела праілюстраваць гісторыі коцікаў, якія шмат пакутавалі, але ўсё ж такі знайшлі свой дом. Ёсць і выявы тых, хто пакуль адзінокі, у іх ліку слепы кот Моня, ласкавы, рахмяны... Сэнс выстаўкі — паказаць, што не страшна браць жывёл з вуліцы ці прытулку. У дзень адкрыцця гасцям былі прапанаваны сувенірныя паштоўкі і магніты, а атрыманыя грошы пайшлі на дапамогу прытулку. Мы запрасілі гаспадароў, якія забралі безнадзейна хворых кошак, каб яны падзяліліся сваім вопытам. Было прыемна, што людзі неабыякавыя да гэтай праблемы і нават прапаноўвалі свае паслугі. Спадзяюся, што па выніках выстаўкі людзі будуць больш адкрытыя ў дачыненні да братоў нашых меншых і кожны коцік знойдзе сям'ю.

Алена ЯКАВЕНКА.

Ведай нашых!

Прыз — сертыфікат на льготнае паступленне

Дзевяцікласніца са Старобіна Дар'я Залеская стала прызёркай XIII Міжнароднага юніёрскага ляснога конкурсу, які праходзіў у Пецяргофе пад Санкт-Пецярбургам. Свае навуковыя працы перад аўтарытэтным міжнародным журы абаранялі 45 юных даследчыкаў з 25 краін.

Дар'я з дакладам «Прафілактыка лясных пажараў з дапамогай экалагічна чыстага інгібітару гарэння» падзяліла другое месца з удзельніцай з Кітая Фан Панвэнь, якая прадставіла даследаванне «Патагеннасць і тэхналогія выяўлення развіцця паразітычнай нематоды сасны». Акрамя дыплома і каштоўнага падарунка, беларускай школьніцы ўручылі спецыяльны прыз: сертыфікат на льготнае паступленне ў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны лесатэхнічны ўніверсітэт імя С. М. Кірава і павышаную стыпендыю падчас навучання.

Міжнародны юніёрскі лясны конкурс праводзіцца Раслесгасам з 2004 года для абмену лесаводча-экалагічнымі ведамі і практычным вопытам, а таксама прыцягнення ўвагі сусветнай грамадскасці да праблем захавання лясоў. Пачынаючы з 2015 года, ён атрымаў афіцыйную падтрымку ўрада Расійскай Федэрацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Нябачнае мастацтва

ЯКІ ЁН, ВОДАР ПОСПЕХУ?

ПРА ГЭТА ВЕДАЮЦЬ «ВАЛАДАРЫ ПАХАЎ»

Калі дызайнер падбірае колеры і расстаўляе мэблю пад густ кліента, то аромамаркетолаг робіць тое самае, толькі... з атмасферай. Людзі гэтай спецыяльнасці ведаюць, якія пахі прымусяць нас збавіць крок і ўсміхнуцца, а з-за якіх захочацца выскачыць за парог і шчыльна зачыніць за сабой дзверы. Часам чалавек можа і не здагадвацца, што амаль нячутны водар прыводзіць яго ў добры настрой, схіляе да шчырасці, а то і бадзёрыць перад адказнай працай.

У 2006 годзе Аляксандр Рудзько прачытаў артыкул пра аромамаркетынг — кірунак, што дазваляе зацікаўліваць пакупнікоў таварам, выкарыстоўваючы пахі. Сапраўды, мала хто можа спакойна прайсці міма крамы, адкуль смачна патыхае свежым печывам, ці не затрымацца ў кавярні, дзе між столікаў плыве водар кавы, вяршкоў і бісквітаў. На той час прывезці абсталяванне і аддушкі ў Беларусь можна было толькі з-за мяжы, і Аляксандр з аднадумцамі сталі прадстаўнікамі напачатку расійскіх, а потым і іншых замежных кампаній. Паступова ў прадпрымальных беларусаў склаўся ўласны погляд пра водары і абсталяванне, аказалася, што ў жыхароў розных рэгіёнаў свае схільнасці да пахаў. Замежныя вытворцы не заўсёды з гэтым лічыліся, і каманда паціху перайшла ад пасярэдніцтва да ўласнай вытворчасці.

Добры прадавец падобны да псіхолага: ён заўважае змены ў эмацыйным настроі пакупніка і прадказвае яго пажаданні. Аромамаркетолаг спрабуе зразумець схільнасці не толькі свайго заказчыка, але і яго кліентаў. Перад тым як запаўняць пакой пахамі, спецыяліст ацэньвае тэматыку, інтэр'ер памяшкання, колеры, аздабленне, асвятленне, узрост і пол магчымых наведвальнікаў і яшчэ шмат дэталяў. У пакоі пах павінен прысутнічаць у сугучы з прадметам, які выклікаў бы патрэбную асацыяцыю. Напрыклад, ракавіны вымагаюць водару мора, суніцамі пахне ў пакоі, дзе ёсць хаця б фотаздымак гэтых ягад. Трэба таксама ўлічваць, што ў розных краінах да аднаго і таго ж паху будзе рознае стаўленне.

«Дастаўцы заказчык не ўзрадаваўся, бо хацеў не пах, які ідзе ад слана, а водар джунгляў, дзе жыве слон».

— Для славян пах скошанай травы асацыюецца з летам, цяплом, адпачынкам. Нам ён прыемны і падымае настрой, — прыводзіць прыклад Аляксандр. — Амерыканец жа прыгадае сезонны абавязак касіць газон перад домам, і яго падсвядомасць пераключыцца на не самыя лепшыя ўспаміны. У той жа час у ЗША водар лімона звязаны са святамі, ліманадам, Днём незалежнасці, лімонным пірагом, а вось у нас у канцы мінулага стагоддзя так пахла ледзь не ўся бытавая хімія, і неблагі водар аказаўся «сапсаваным». Ён асацыюецца з прыборкай, як пах хвоі — з асвяжальнікамі паветра.

Каб адшукаць пах, прыемны беларусу, трэба ведаць сферу прымянення водару. Напрыклад, у сферы продажу прадуктаў гэта пах бісквіту, ванільна-карамельны водар. Ён для нас звязаны з віншаваннямі, святам, калі ласуюцца тортам. Таксама мы заўважылі, што беларускія кліенты ўсміхаюцца, калі ім прапаноўваеш панюхаць пробу з аддушкай чорных парэчак.

Аромамаркетынг дапамагае не толькі ў продажы прадуктаў. Араматызацыя ў офісе можа бадзёрыць супрацоўнікаў раніцай. Пахам па сілах ствараць пачуццё ўтульнасці ў гасцініцы, атмасферу спакою і чысціні — у санаторыі, даверу — у клубе, раскошы і перспектыўнасці — у дзелавым кабінеце. Набыць «уласны» пах таксама жадаюць некаторыя музеі, тэатры, кінатэатры, турыстычныя фірмы...

— Часам людзі заказваюць араматызацыю буйных карпаратыўных мерапрыемстваў на сотні ўдзельнікаў. Тады ідзе дапамога адразу па некалькіх кірунках: выдаленне непрыемных пахаў, што часта застаюцца ў вялікіх памяшканнях, падняцце настрою гасцям, падтрымка тэматыкі свята. Аднойчы мы араматызавалі вяселле ў Гродне, — прыгадвае Аляксандр. — Для ўрачыстасці маладыя выбралі тэнісны корт у спартыўным комплексе. Трэба было пазбавіцца ад паху гумы і замяніць яго на водар кветак і дрэва.

Здараюцца ў аромамаркетолагаў і па-сапраўднаму дзіўныя заказы. Часцей за ўсё яны звязаны з непаразуменнямі паміж бакамі. Так, Аляксандр прыгадвае выпадак з латвійскімі калегамі па цэху: «Адміністрацыя дзіцячага дома дамовілася, што ім прывязуць пахі для муляжоў жывёл, зробленых з пап'е-машэ. Меркавалася, што дзеці змогуць наведваць такі імправізаваны заапарк у садзе. Заказчыкі выказалі сваё пажаданне так: «Хочам пах слана». Калегі накіравалі запыт сваім вытворцам у Францыі, тыя пайшлі ў звярынец і падабралі кампазіцыю, падобную на пах гэтай жывёлы. Аднак дастаўцы заказчык не ўзрадаваўся, бо хацеў не пах, які ідзе ад слана, а водар джунгляў, дзе жыве слон. У нас таксама быў выпадак, калі кліент патрабаваў пах арэхавага дрэва. Мы супрацоўнічаем з парфумерам, які ведае больш за тысячу розных пахаў, але той так і не змог вызначыць, чаго хоча заказчык, бо арэхавых дрэваў сотні відаў, да таго ж невядома, пах плода ці драўніны хоча заказчык. Як пазней высветлілася, той сам дакладна не ведаў, проста ў інтэрнэце прачытаў, што такі водар павялічвае даходы ўстановы, што спецыялізуецца на азартных гульнях. Бывае, што кліенты не ўяўляюць, як пахне іх заказ, а потым высвятляецца, што пах, напрыклад, інжыру ім непрыемны».

Фота Надзеі БУЖАН.

«Для славян пах скошанай травы асацыюецца з летам, цяплом, адпачынкам. Амерыканец жа прыгадае сезонны абавязак касіць газон перад домам».

Араматычнага картрыджа хапае больш чым на чатыры тыдні, хоць можна ўзнаўляць яго па неабходнасці. Пакуль абсталяванне для араматызацыі разлічана на камерцыйныя памяшканні з вялікай плошчай і складанай планіроўкай, аднак Аляксандр з сябрамі ўжо задумваецца над лінейкай прыбораў для хатняга карыстання.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by

У страі з Зеўсам і Норай

Старшы інспектар-кінолаг Антон Жалезнякоў працуе з бельгійскай аўчаркай (малінуа), якая вылучаецца хуткасцю і скакучасцю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

На першым жа конкурсе прафесіянальнага майстэрства, у якім навяспечаны тандэм браў удзел, ён заняў чацвёртае месца з 14 пар. Тады ж маладога кінолага заўважыла кіраўніцтва гадавальніка і прапанавала працу. Першым часам даводзілася штодзень ездзіць з Камянца ў Брэст, але кватэрнае пытанне вырашылася: хлопцу выдзелілі жыллё ў інтэрнаце.

— Праца з сабакамі мяне пачала цікавіць гадоў у 13, — прыгадвае сваю гісторыю Мікалай. — У нас быў знаёмы, які захапляўся паляваннем. Вядома, меў гадаванца, з якім я ўвесь час вазіўся. Мы разам хадзілі ў лес, падчас гэтых прагулак гаспадар расказваў мне пра дрэсіроўку, я пачаў атрымліваць фрагментарныя веды. Калі прызываўся, у ваенкамаце, як той казаў, вынес усім мазгі: «Хачу ў кінолагі — і ўсё тут». У выніку трапіў у Мінск, у ахову войскаў паветранай абароны, дзе займаўся якраз сабакамі. Па вяртанні ў Брэст доўга не мог уладкавацца на працу, бо пра Дэпартамент аховы не ведаў. Неяк пачуў, што кінолагі патрэбны ў 38-й дэсантна-штурмавой брыгадзе. Уладкаваўся туды на «кантракт», але па сутнасці два гады адслужыў зусім па іншым профілі. Пасля нарэшце ў тэлерэкламе ўбачыў, што кінолагаў запрашаюць у Дэпартамент аховы. Мне адразу ж выдзелілі шчаня па мянушцы Нора. Вось ужо тры гады з ёй і працую, першы з іх яна нават жыла разам са мной на кватэры.

Хто каго дрэсіруе?

Як жа наладжана праца самога гадавальніка? За кожным кінолагам замацавана па адным выхаванцы, якіх дрэсіруюць па так званым агульнапошукавым профілі. Усё пачынаецца з племяннай працы — ёсць асобіны, якія выкарыстоўваюцца для размнажэння. Акрамя таго, калі ёсць жаданне, кінолагі маюць права самі шукаць сабе гадаванцаў. Шчанюкі праходзяць адбор, бо далёка не ўсе здольныя служыць у міліцыі. Спецыяльнае тэсціраванне дапамагае вызначыць фізічны стан жывёлы, а таксама яе працоўныя якасці і тэмперамент. Калі з першым аспектам усё проста (сабакі, якія маюць фізічныя заганы і праблемы са здароўем, адбракоўваюцца), то другі патрабуе вельмі ўважлівага падыходу. Шчаня павінна праяўляць цікавасць да працы з чалавекам, хутка рэагаваць на знешнія раздражняльнікі, карацей, быць актыўным.

Акрамя нямецкай аўчаркі ў гадавальніку ёсць і бельгійскія (дакладней, іх разнавіднасць з кароткай поўсцю — малінуа). Нягледзячы на ўніверсальнасць абедзвюх парод, апошняя вылучаецца сваёй высокай энергічнасцю. «Бельгійцы» па памерах і фізічнай сіле саступаюць «немцам», але пераўзыходзяць іх па хуткасці і спрыце.

— Як бельгійскую, так і нямецкую аўчарку трэба дрэсіраваць індывідуальна, — расказвае Дзмітрый. — Сабака не аўтамабіль, няма ўніверсальных методык для ўсіх. Да кожнай трэба падыходзіць па-свойму. Але агульныя моманты, безумоўна, падобныя. Выкарыстоўваюцца гульнявы метад, смака-заахвочвальны і іншыя. Галоўны прынцып — вучыцца трэба крок за крокам, ад простага да складанага. Пачынаем мы са знаёмства — шчаня павінна адрозніваць свайго гаспадара ад іншых. Кінолаг праводзіць з гадаванцам вельмі шмат часу, пастаянна гуляе з ім, наладжвае кантакт. Калі сабака пачынае вылучаць аднаго чалавека з шэрагу іншых, здалёк распазнае яго, можна ісці далей. Гэта добры падмурак і знак, што ўсё адбываецца паводле плана.

Потым задачы ўскладняюць. Каманды падаюць на большай адлегласці ці ўвогуле змяняюць памяшканне для дрэсіроўкі. Трапляючы ў новыя ўмовы, гадаванец звычайна спачатку забываецца пра свайго гаспадара, але пасля разумее, што самае цікавае для яго ў навакольным свеце — менавіта кінолаг. Шматразова паўтараючы гэты працэс, спецыялісты дабіваюцца таго, што сабака спраўна выконвае любыя каманды ў любых умовах, не звяртаючы ўвагі на абставіны і знешнія раздражняльнікі. Службовых сабак ад звычайных адрознівае тое, што яны не зацікаўлены нічым, акрамя работы з гаспадаром.

Пасля праходжання агульнага курса падрыхтоўкі (таго, што павінны ўмець усе службовыя сабакі: шэрагу простых камандаў і пераадолення паласы перашкод), надыходзіць чарга спецыяльнага. Гадаванцаў вучаць «браць след», выбіраць чалавека і рэчы, праводзіць вобыск памяшкання, шукаць гільзы, затрымліваць умоўнага злачынцу. Па дасягненні пэўнага ўзросту (звычайна 14 месяцаў) сабакам дазволена заступаць на службу. Іх і кінолагаў чакаюць экзамены, падчас якіх вызначаецца здольнасць выхаванца выконваць самыя розныя загады на адлегласці 25 метраў (для гэтага існуе спецыяльная пляцоўка). Калі выпрабаванні праходзяць паспяхова, можна прыступаць да нясення службы.

Сабакі разумеюць сваіх гаспадароў без слоў.

— Трэба сказаць, што сама дрэсіроўка не заканчваецца ніколі, — заўважае Дзмітрый. — У кінолагаў няма мяжы дасканаласці. Кожны навык можна развіваць бясконца доўга. Калі сабака нечага не ўмее, ён не можа паўнавартасна служыць. У кожнага кінолага ёсць свой план працы, своеасаблівы дзённік, дзе кіраўніцтва прапісвае, якія аспекты трэба ўдасканаліць. Да таго ж мы ўвесь час спрабуем новыя методыкі, якія «падглядаем» у калег з іншых рэгіёнаў на спаборніцтвах.

Галоўны профіль працы сабак у Дэпартаменце аховы, натуральна, ахова аб'ектаў. Пры любым парушэнні рэжыму на месца адразу ж выпраўляецца аператыўная група, у складзе якой можа быць і кінолаг з сабакам. Калі парушальнік здолеў уцячы, яго могуць хутка знайсці па слядах. Махнатыя вартаўнікі адпраўляюцца працаваць на спецыяльна абсталяваным аўтамабілі, у багажніку якога ёсць нават кандыцыянер. З сабой бяруць і так званы кіналагічны трывожны заплечнік, у якім захоўваецца ўсё патрэбнае для догляду сабакі. Графік дзяжурства — дзень праз два.

«Псіхалагічная зброя»

— Прымяняць веды на практыцы даводзіцца нярэдка, — кажа Мікалай. — У сярэднім раз на дзень нас куды-небудзь выклікаюць. Летась, калі не памыляюся, сярэдняя лічба якраз складала 1,2 выкліку за суткі. Праца бывае самай рознай, не толькі пошук па следзе. Асабіста я за апошні год раскрыў тры крымінальныя справы. Напрыклад, у гасцініцы адпачывала вялікая кампанія, каля дзесяці чалавек, і ў аднаго з іх скралі дарагі мабільны тэлефон. Па запісах камеры назірання мы ўстанавілі, што з пакоя ніхто не выходзіў, а значыць, тэлефон усё яшчэ ўнутры. Далі Норы панюхаць гаспадара тэлефона. Яна выбегла ў калідор, дзе стаяла кампанія, падышла да аднаго з яе ўдзельнікаў, пачала штурхаць носам. Правялі агляд і знайшлі ў бялізне той самы тэлефон.

Кінолагі расказваюць пра самыя розныя эпізоды са сваёй практыкі. Злодзей прайшоўся адразу па трох кватэрах у адным раёне — пакуль гаспадары вярнуліся дадому, сабака ўжо адшукаў злачынцу і ўсе зніклыя рэчы. Даводзілася шукаць пенсіянераў, якія пайшлі ў грыбы і заблудзілі ў лесе. І яшчэ дзясяткі самых розных гісторый... Кінолагі ўсміхаюцца — іх заробак залежыць ад работы гадаванцаў, бо за раскрыцці злачынстваў супрацоўнікам даюць прэміі.

...Разам з кінолагамі выходзім на экскурсію ў двор. Спачатку разглядаем «казармы»: паабапал дарожкі размяшчаецца некалькі дзясяткаў загонаў, аддзеленых сеткай (па прызнанні кінолагаў, для той жа малінуа пераскочыць такую перашкоду няцяжка, але дрэсіроўка адвучвае іх ад жадання гуляць самастойна). У кожным загоне знаходзяцца міска, паілка і зімні кабінны павільён, дзе штодзень мяняюць салому. Здзіўляе, што на прыход пабочных людзей сабакі амаль не рэагуюць, а вось калі на гарызонце з'яўляюцца кінолагі, іх выхаванцы, здаецца, гатовы выскачыць са скуры ад радасці.

Дзмітрый з Зеўсам і Мікалай з Норай дэманструюць нам свае навыкі. Узровень вывучкі сабак уражвае: усе загады яны выконваюць па камандзе як жэстамі, так і голасам. Асабліва відовішчна аўчаркі праходзяць паласу перашкод, пераадольваючы двухметровыя сценкі за долі секунды. Здаецца, што сабакі разумеюць гаспадароў на нейкім падсвядомым узроўні: прыкрываюць тыл падчас руху, прыкідваюцца мёртвымі і ў любы момант гатовы рвануць наперад, каб затрымаць злачынцу.

— Па-сапраўднаму атакаваць людзей службовым сабакам амаль не прыходзіцца, — кажа Мікалай. — Бываюць выпадкі, калі трэба прыехаць разабрацца з агрэсіўнай моладдзю дзе-небудзь на дыскатэцы. Выклікаюць кінолага, ён прыязджае на месца і загадвае сабаку падаць голас — праз секунду смеласць у хулігануў знікае. Часам на затрыманнях трэба, каб злачынца не рухаўся, а смірна стаяў тварам да сцяны. Тады кінолаг папярэджвае, што пры любым руху аўчарка можа без папярэджання атакаваць пахвінную зону. Затрыманыя стаяць, як статуі, зрэдку паглядваючы на свайго вартаўніка. Службовы сабака — гэта яшчэ і псіхалогія, таму яны вельмі моцна дапамагаюць міліцыі. І вы не глядзіце, што бельгійскія аўчаркі выглядаюць не так пагрозліва, як «немцы» — гэты сабака з лёгкасцю збівае з ног дарослага чалавека, а сіла ўдару такая, што ён сам можа атрымаць кампрэсійную траўму.

Усім гадаванцам прызначана двухразовае сілкаванне. Адзін за суткі можа з'ядаць кілаграм фаршу, 600 грамаў круп, 200 грамаў бульбы, 100 грамаў гародніны — неблагое меню! Штодзень рацыён мяняецца — харчаванне павінна быць збалансаваным.

— Гэта не проста праца, — падводзіць вынік нашай сустрэчы Мікалай. — Нельга прызначыць на такую работу «выпадковага» чалавека, які не любіць сабак, бо ў яго нічога не атрымаецца. Мы практычна ўвесь свой час аддаём гадаванцам, разам працуем, снедаем, вячэраем. Ці люблю я сваю працу? Безумоўна, я гатовы прысвяціць гэтаму ўсё жыццё.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*
Мінск — Брэст — Мінск.

Шчанюкі праходзяць адбор, бо далёка не ўсе здольныя служыць у міліцыі. Спецыяльнае тэсціраванне дапамагае вызначыць фізічны стан жывёлы, а таксама яе працоўныя якасці і тэмперамент.

Пераадольваць перашкоды кінолагам нярэдка даводзіцца поруч з гадаванцамі.

Навык з шэрагу абавязковых: прыкрыццё ўзброенага міліцыянера, у тым ліку і з тылу.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Наименование продавца (балансодержателя)	№ лота	Наименование объекта торгов, краткие характеристики	Местонахождение	Условия продажи	Начальная цена продажи, без учета НДС, BYN	Задаток, BYN
ОАО «Малоритский консервноовоще-сушильный комбинат»	1	Незавершенный законсервированный цех плодоовощных консервов для детского питания с инв. №103/U-9173, общ. пл. 5047,0 м², расположенное на земельном участке пл. 1,0702 га с кадастровым номером 125250100001002660	Брестская обл., г. Малорита, ул. Заводская, 9А	без условий	21,00	2,10
	2	Капитальное строение (инв. №142/С-10969), общ. пл. 647,2 м² – здание котельной, расположенное на земельном участке пл. 0,3085 га с кадастровым номером 125250100001000205. В состав капитального строения входит забор (ж/б плиты, сетка-рабица, кирпич), протяж. 180 м п.	Брестская обл., г. Малорита, ул. Лермонтова, 16Б	без условий	25 366,20	2 536,62

Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245

Аукцион состоится 29 сентября 2016 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 28 сентября 2016 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

Номер лота	Предмет торгов	Начальная цена без НДС, BYN	Размер задатка, BYN
Лот №1	Капитальное строение (инв.№ 100/С-45596) – склад, общ. пл. 1081,2 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121284004601000878, пл. 0,3349 га	98 983,80	1 886,64

Местонахождение объекта	Брестская обл., г. Брест, ул. Городская, д. 54
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Брестское пчеловодство»
Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245

Аукцион состоится 18 октября 2016 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 17 октября 2016 г. до 17.00.
Другие сведения, необходимые участникам аукционных торгов, можно узнать по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

ОРГАНИЗАТОР: КРУГЛИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

№ лота	Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение	Условия и ограничения	Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма залога, руб.
1	д. Хотлино, ул. Набережная, д. 13, площадь – 0,2490 га, кадастровый номер 225182312101000010	Для строительства и обслуживания жилого дома	Водоохранная зона озера Хотлинское	183,00	828,70	82,87
2	д. Хотлино, ул. Набережная, д. 13А, площадь – 0,2492 га, кадастровый номер 225182312101000011	Для строительства и обслуживания жилого дома	Водоохранная зона озера Хотлинское	183,00	829,36	82,94

1. **Аукцион состоится 14 октября 2016 года в 10.00 по адресу: ул. Парковая, д. 15, д. Круглица, сельисполком.**

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская область, Чашникский район, улица Парковая, д. 15, деревня Круглица, сельисполком. **Последний день приема заявлений – 10 октября 2016 года до 17.00.**

3. Для участия в аукционе необходимо представить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования) представителю гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату залога на расчетный счет 3641329042207 ЦБУ №222 филиала №215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код 647, УНП 300986823, код платежа 04901, получатель – Круглицкий сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 802133 6 42 35 802133 6 42 45.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Оценка всех видов собственности

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», 8 (0232) 21 60 07

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– Капитальное строение (столовая) с инвентарным номером 350/С-141588, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/20 (составные части и принадлежности: рампа с навесом на металлических столбах площадью 74 м кв., вент. камера площадью 12 м кв., заборы 72 м п. и 126 м п., асфальтобетонное мощение площадью 231 м кв., бетонное мощение площадью 80 мп, бордюры проезжей части из бортовых камней площадью 130 м, бордюры тротуара из бортовых камней площадью 30 м) по начальной цене – 626 341 руб. 34 коп. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006508 площадью 0,7415 га. – Оборудование: 1. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10141 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 2. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10142 – 65 руб. 47 коп. 3. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10143 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 4. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10144 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 5. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10145 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 6. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10146 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 7. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10147 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 8. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10148 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 9. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10149 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 10. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10150 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 11. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10151 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 12. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10152 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 13. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10153 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 14. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10154 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 15. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10155 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 16. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10156 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 17. Пункт распределительный ПР-9000 с инв. №10157 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 18. Конденсаторная установка БСК-0,76кВар с инв. №10268 по начальной цене – 434 руб. 78 коп. 19. Конденсаторная установка БСК-0,76кВар с инв. №10269 по начальной цене – 434 руб. 78 коп. 20. Распределительный пункт ПР-9322-405с инв. №10288 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 21. Распределительный пункт ПР-9322-405с инв. №10290 по начальной цене – 65 руб. 47 коп. 22. Лифт грузовой с инв. №12288 по начальной цене – 4 532 руб. 83 коп. 23. Лифт грузовой с инв. №12588 по начальной цене – 6 291 руб. 07 коп. 24. Лифт грузовой с инв. №1611 по начальной цене – 4 532 руб. 83 коп. 25. Лифт грузовой с инв. №1613 по начальной цене – 6 291 руб. 07 коп. 26. Трансформаторная подстанция 2КТП с инв. №221/1М по начальной цене – 9 363 руб. 26 коп.	**659 465 руб. 89 коп.** **(6 594 658 900 бел. руб. – в ценах до 01.07.2016 г.)**	**65 946 руб. 59 коп.** **(659 465 900 бел. руб. – в ценах до 01.07.2016 г.)**

Срок подачи заявления	**По 26 сентября 2016 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**
Дата, время, место проведения аукциона	**27 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266 Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация»
Условие пользования	Объекты продаются в собственность
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Подробная информация в газете «Звязда» от 08.07.2016 г. и по тел.: 8(0232) 75 06 62, 8(029) 341 15 45

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.
Продавец: ОАО «Витрембыт», 210035, г. Витебск, ул. Терешковой, 3, тел. (0212) 48-79-82

Лот №1. Капитальное строение с инв.№250/С-33739 по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 38, площадью 292,5 кв.м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание производственно-административное на зем. участке с кадастровым №245500000004000118 площадью 0,0727 га. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации): 257 040/2 570 400 000 бел. руб. с НДС. **Задаток** (с учетом/до деноминации): 25 704/257 040 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **30.09.2016 в 10.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: **с 15.09.2016 с 8.30 по 29.09.2016 до 17.00.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Покупателю по его письменному заявлению может предоставляться рассрочка оплаты на срок до 9 месяцев. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Обременение: договора аренды сроком до 20.02.2017 и 23.03.2017. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 28.07.2016.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится в сроки, указанные в договоре купли-продажи. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже права заключения договора аренды земельного участка

Наименование объекта	Лот № 1
Целевое назначение	Установка торгового павильона
Местонахождение объекта	аг. Ляховцы, ул. Малоритская, 6А
Продавец объекта	Мокранский сельский исполнительный комитет
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет
Начальная цена продажи, руб.	97,26
Сумма задатка, руб.	9,73
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер	0,0106 га, решение Малоритского районного исполнительного комитета от 04.07.2016 г. № 778, кад. № 125280020101000654
Ограничения в использовании земельного участка	Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0009 га
Вещное право, срок аренды земельного участка	Аренда 99 лет
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб.	1437,84
Условия продажи	1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся: 1.1. внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); 1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в том числе на формирование земельного участка, государственной регистрации создания этого земельного участка; 2. заключить с Малоритским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок; 3. обеспечить вынос кабелей связи из границ земельного участка за собственные средства; 4. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительства объекта в срок, не превышающий одного года; 5. приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта; 6. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации.

Аукцион состоится 17 октября 2016 года в 12.00 по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.

Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 30 01, 2 30 17, 2 28 03.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с № 3600223050290 ЦБУ № 120 АСБ «Беларусбанк» г. Малорита, код 246, код платежа 04902, получатель платежа – Мокранский сельский Совет депутатов, УНН 200070394.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина– нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц– документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

Заявления об участии в аукционе принимаются до 12 октября 2016 года (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 82, землеустроительная служба Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.

Сваімі рукамі

САПРАЎДНЫЯ МУЖЧЫНЫ

ЯК ЯНЫ БАВЯЦЬ ЧАС І ЧЫМ ПРЫЦЯГВАЮЦЬ ДЗЯЎЧАТ

Хочаш, каб атрымалася добра, — зрабі сам! Такога прынцыпу прытрымліваюцца ўдзельнікі развіццёвага клуба «Торчвуд». Маладыя людзі збіраюцца разам, каб абмеркаваць навінкі ў лічбавай індустрыі, навучыцца паяць і спасцігнуць асновы праграмавання. Максім КАЧЫНСКІ, студэнт чацвёртага курса Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя аўтамабілебудавання і арганізатар суполкі, расказаў нам пра будні клуба.

Ён названы як аднайменны серыял пра дзейнасць выдуманага інстытута, у якім даследуюць паранармальныя з'явы. Яго ўдзельнікі, вядома, прышэльцаў не вывучаюць, затое разбіраюцца ў фізіцы, хіміі, інфарматыцы і нават псіхалогіі. Змагаюцца з невуцтвам і лянотай, а гэта цікавей за ўсякіх там гуманоідаў.

— На першым курсе ліцэя я быў членам маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Фаланстар», арганізаваў свой першы клуб па камп'ютарных гульнях. Мы прыходзілі са сваімі ноўтбукамі, гулялі і дзяліліся сакрэтамі праходжання на новы ўзровень. Аднак у пэўны момант нам усё гэта надакучыла, захацелася нечага больш сур'ёзнага. Так мы пачалі вывучаць радыёэлектроніку. Мой сябар падарыў набор радыёаматара, дакупілі некалькі датчыкаў і сталі разбірацца, што да чаго. Далей «Торчвуд» пашыраўся, і ўзніклі такія праекты, як «Лінуксоўкі» (праца з аперацыйнай сістэмай Linux), «MAYBE» (псіхалогія паводзін, прафайлінг), — расказвае Максім. — Усяго нас 17 чалавек, 13 — актыўныя ўдзельнікі клуба. Навучанне адбываецца па тыпу «хакатона». Гэта калі спецыялісты ў розных сферах разам працуюць над рашэннем нейкай праблемы. Спачатку мы асвойваем матэрыял у інтэрнэце, а потым імкнёмся зрабіць тое ж самае сваімі рукамі. Часта абмяркоўваем распрацоўкі ўсе разам, дапамагаем адзін аднаму ўцяміць, што да чаго. Самаму старэйшаму з нас 35 гадоў, а так пераважна студэнты. Што цікава, 50 працэнтаў нашага калектыву — гэта гуманітарыі.



— А дзяўчаты сярод вас ёсць?

— Неяк у нас паміж парамі была «фортка», і мая сяброўка не ведала, куды дзець вольны час. Прапанаваў ёй пайсці да нас у клуб пасядзець. За кароткі час навучыў паяць ліхтарык. Дзве дзяўчыны прыйшлі да нас з клуба псіхалогіі. Мы можам любога навучыць рамантаваць навушнікі, вырабіць святлодыёдную падсветку для веласіпеда і яшчэ шмат чаго іншага.

З найбольш паспяховых нашых праектаў магу вылучыць «Хатнюю метэастанцыю». Гэта скрынка з дысплеем, які паказвае тэмпературу на вуліцы, у памяшканні, вільготнасць паветра і час. Прылада нечым падобная на гарадскія апараты, але наша мадэль больш мабільная. Напрыклад, калі тэмпература ў доме меншая за 20 градусаў, прыбор адзначыць гэта гукавым ці светлавым сігналам. Для таго каб распрацаваць такую ўстаноўку, нам патрэбна было навучыцца падключаць той жа датчык тэмпературы, прапісваць код і выводзіць дадзеныя на дысплей.

— А што з планамі? Ці ёсць якія цікавыя задумкі?

— Удасканаліць папулярную сістэму домаўладкавання «Разумны дом». Мэта гэтага праекта — максімальна аўтаматызаваць і засцерагчы жыллё. Мы плануем узяць стары планшэт, прымацаваць да дзвярэй, каб ён, акрамя стандартнай інфармацыі кшталту надвор'я і і часу, паказваў, хто і калі выходзіў з дома, якія прылады зараз уключаны. Напрыклад, калі ў нейкім пакоі перагарэла лямпачка, то наша прылада павінна будзе адрэагаваць на гэта і апавясціць вас паведамленнем на тэлефон. Можна будзе праз мабільны тэлефон убачыць электраспажыванне ў доме. Гэта вельмі актуальна ў тым выпадку, калі вы забыліся выключыць электрапрыборы. Яшчэ мы плануем запусціць праект «WWW» па вэб-распрацоўцы. Гэта выкарыстанне свабодных сістэм кіравання сайтамі, наладка хостынгу, абслугоўванне сервера, а галоўнае — абмен вопытам.

— Дзе бераце грошы на свае задумы?

— Зараз нам неабходна закупіць электронныя замкі, лічбавыя датчыкі для электрасеткі, платы кіравання і іншае абсталяванне. Звычайна ўсё патрэбнае мы купляем за свае грошы. Пачаткоўцам таксама прапаноўваем зрабіць пэўны грашовы ўклад, каб не было так, што прыйшоў, пакарыстаўся, кінуў і пайшоў. Я лічу, калі ты ў нашай камандзе, то цябе датычацца ўсе праблемы клуба. Напрыклад, доўгі час у нас не было асобнага памяшкання. Работу клуба прыйшлося спыніць. Мы развярнулі краўдфандынгавую кампанію. Напісалі рэкламны тэкст, зрабілі інфаграфіку, дзе падрабязна растлумачылі, на што пойдуць ахвяраваныя грошы. У залежнасці ад сумы распрацавалі сістэму заахвочвання. Так, за 150 тысяч рублёў старымі мы абяцаем відэападзяку ў групе «УКантакце», а за мільён — хэндмэйд-майку з лагатыпам «Торчвуд». Прайшло некалькі дзён, ніхто не адгукаўся. Але потым патэлефанаваў лідар адной маладзёжнай музычнай групы і прапанаваў размясціцца ў іх на другім паверсе катэджа. Так мы зноў абзавяліся сваім «кутком». Наогул, я лічу, што наша праца нясе толькі пазітыў. Таму будзем рады новым сябрам.

Алена ЯКАВЕНКА.

Адпачынак... пад вадой

ХТО КУДЫ, А МЫ — НА ДНО!

Чым яно вабіць дайвераў

У дзяцінстве Юрый ШПІЛЕЎСКІ любіў глядзець фільмы Жака-Іва Кусто. Захапленне падводнымі пейзажамі напачатку прывяло шасцігадовага хлопчыка на заняткі ў мінскі басейн Палаца воднага спорту, а потым на семінары курс-дырэктара міжнароднай арганізацыі PADI (прафесійнай арганізацыі інструктараў па дайвінгу) у Кіеве. У 2013 годзе Юрый атрымаў пасведчанне інструктара і адкрыў уласны дайв-клуб. Цяпер ён не толькі нырае сам, але і дапамагае іншым палюбавацца прыгажосцю, якой не сустрэць на паверхні.

— Хто найперш цікавіцца дайвінгам?

— Насамрэч не існуе нейкага цэнзу. Чалавек хоча ныраць, і яму дапамагаюць здзейсніць мару. У групе бывае моладзь, людзі ў гадах, бацькі з дзецьмі. Пераважна ўсе з Беларусі, але цяпер ёсць і два курсанты з Расіі. Кожны прыходзіць, як яму зручна: нехта адплавае трэніроўкі за тыдзень, нехта будзе хадзіць месяц.

— Наколькі бяспечныя заняткі падводным плаваннем?

— Дайвінг — гэта парны від актыўнага адпачынку. Так што на вадаём выязджаем групамі ў некалькі чалавек. Сітуацыі, якія могуць узнікнуць, папярэдне адпрацоўваем у басейне. Але я не назваў бы гэтыя навыкі паводзінамі ў экстрэмальнай сітуацыі. Усё, што мы робім, адносіцца да звычайных выпадкаў апускання з аквалангам. З ім трэба ўмець абыходзіцца, як з любым абсталяваннем, гэтак жа як і ўзаемадзейнічаць з іншымі плыўцамі. За ўвесь час, пакуль ныраю, небяспечныя сітуацыі ні разу не здараліся.

«Часта просяць адшукаць на дне затанулы прадмет. Самае распаўсюджанае — дастаць вінт ці рухавік ад маторнай лодкі».

— Ці забіраеце з сабою знаходкі на паверхню? Напрыклад, старадаўнія рэчы?

— Ёсць дакладныя прынцыпы паводзінаў дайвера пад вадой. Усё, што мы можам пасля сябе пакінуць, — бурбалкі ад кісларoду, усё, што можам з сабою забраць, — уражанні і фотаздымкі. Нават калі проста камень на дне ляжыць, то навошта яго варушыць? Няхай наступны нырэц таксама на яго паглядзіць. Што тычыцца пошукаў старадаўніх прадметаў, тут трэба звязвацца з Акадэміяй навук, падымаць археалагічную базу. У нас існуюць клубы, якія мэтанакіравана займаюцца даследаваннем дна на прадмет гістарычных знаходак, аднак патрэбны навукоўцы, каб падказаць, дзе і што шукаць. Мы такімі пошукамі не займаемся, хоць, калі трапіцца незвычайная рэч, паведамім спецыялістам.

— Падводнае плаванне — толькі хобі, ці падчас апускання каманда можа выконваць нейкую дадатковую задачу?

— Ныраем дзеля задавальнення, але часам атрымліваецца сумясціць, як той казаў, прыемнае з карысным. Напрыклад, у Сусветны дзень ачысткі вадаёмаў наш дайв-клуб выехаў на возера Некалач, што ў Лепельскім раёне. Да гэтага мы некалькі разоў там былі і ведалі, што ў зонах адпачынку сабралася шмат смецця. Раённае кіраўніцтва пайшло насустрач, і нам прывезлі кантэйнеры. За дзень паспелі выцягнуць мноства розных рэчаў: колы, бутэлькі, вёдры. Трапіўся нават веласіпед. Яшчэ нас даволі часта просяць адшукаць на дне затанулы прадмет. Самае распаўсюджанае — дастаць вінт ці рухавік ад маторнай лодкі.

— Наколькі цікава ныраць у беларускіх азёрах?

— Мне даводзілася бываць на Нарачы, Рудакове, у заслаўскіх і слуцкіх кар'ерах, Доўгім, паўночным і паўднёвым Воласах, яшчэ на некалькіх Браслаўскіх азёрах. Кожнае мае сваю адметнасць: у адным глядзіш на рыбу, у другім — на донныя адкладанні. Незвычайна выглядаюць затопленыя дрэвы, аброслыя водарасцямі.

— Возера Доўгае ў Беларусі самае глыбокае. Што можна ўбачыць на глыбіні больш як пяцьдзясят метраў? Ды і вада там не прагравается...

— На самым дне толькі сапрапель, глей. Усё цікавае расце вышэй. У вадаёма незвычайны рэльеф дна. Калісьці ледавік вымыў частку пароды. Утварылася нешта, падобнае на скалы, яны і прываблiваюць нырцоў.

У беларускіх азёрах холадна ўжо на глыбіні 18 метраў, тэмпература не падымаецца вышэй за 4 градусы. Для такіх апусканняў дайверы праходзяць спецыяльныя курсы і апранаюць так званыя сухія касцюмы, сухія пальчаткі, шлем. Такая амуніцыя па будове нагадвае скафандр для касманаўта, толькі ў больш мяккім, эластычным варыянце. У ім выкарыстоўваецца герметычная маланка. Так цела лепей зберагае цяпло.

— Якія адрозненні паміж дзённым і начным апусканнямі? Асаблівасці падлёднага дайвінгу?

«Усё, што мы можам пасля сябе пакінуць, — бурбалкі ад кісларoду, усё, што можам з сабою забраць, — уражанні і фотаздымкі».

— Калі казаць пра Беларусь, то асаблівай розніцы няма, толькі, натуральна, уначы будзе значна цямней. А калі браць той жа Егіпет, то ноччу выплываюць на паляванне драпежныя рыбіны, з'яўляюцца малюскі, беспазваночныя, якія хаваюцца ў светлы час, пачынае свяціцца планктон... Калі гаварыць пра падлёдны дайвінг, то пры падрыхтоўцы да нырання трэба зрабіць спецыяльныя паметкі на лёдзе. Калі раптам страховачны канец абарвецца, такая разметка дазволіць чалавеку пад вадой знайсці майну (вялікую палонку для нырання) і выбрацца на паверхню. Мне ў падлёдных апусканнях асабліва падабаецца тое, што вада становіцца празрыстай, уся мікраскапічная расліннасць, якая плавае там летам, адмірае, і бачнасць павялічваецца. Раслін становіцца меней, вялікія рыбы хаваюцца ў глей, так што відаць толькі спінкі, малькі збіраюцца ў месцах стыку дна і лёду, дзе ўтвараюцца паветраныя «кішэні»...

Юрыю выпадала плаваць пад вадой у Латвіі, Літве, Украіне, Нарвегіі, Егіпце, Мальце, на Канарскіх астравах... Апусканні перастаў лічыць пасля першай тысячы. Аднак параўноўваць мясціны паміж сабой дайвер не хоча. Кажа, што ў кожнага вадаёма ёсць свая «разыначка», таму і спускацца на дно заўсёды цікава.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

Нясумнае лета

Рамантыка палатачнага лагера

Падчас летніх канікул у краіне адпачылі і ўмацавалі здароўе ў лагерах усіх тыпаў 358,6 тысячы дзетак пры плане 349,4 тысячы.

Іншымі словамі, патрэба ў летнім аздараўленні была задаволена ў поўным аб'ёме: усе ахвотныя хлопчыкі і дзяўчынкі атрымалі пуцёўкі. Па інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, ахоп аздараўленнем склаў 32 працэнты ад агульнай колькасці дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў.

Каб яны займаліся цікавымі для сябе відамі дзейнасці, была арганізавана работа абаронна-спартыўных, ваенна-патрыятычных, спартыўна-аздараўленчых, палатачных, турыстычна-краязнаўчых, а таксама аздараўленчых летнікаў для высокаматываваных дзяцей. Асаблівая ўвага надавалася падлеткам, якія стаяць на прафілактычным уліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх, дзецям, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Усяго ў летні перыяд у краіне працавалі 6164 аздараўленчыя лагеры, у тым ліку 1559 з кругласутачным знаходжаннем і 4605 — з дзённым. Падчас канікул былі адкрыты 954 лагеры працы і адпачынку, у якіх аздаравіліся і падзарабілі 15,9 тысячы падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
15 09 2016 г.

SEX=БАЛЯСЫ

КАБ НЕ ЯК У МОРЫ КАРАБЛІ

Нядаўна мяне здзівілі амерыканцы. Калі дакладней, тамтэйшыя псіхолагі, якія правялі чарговыя даследаванні, спрабуючы высветліць, чаму многія пары расстаюцца, як толькі пачынаюць жыць разам. Вы ўжо ўсміхаецеся? Правільна, у нас па гэтым пытанні не тое што кожны другі, нават кожны першы — псіхолаг, які без аніякіх даследаванняў можа выдаць пералік прычын, з-за якіх разбягаюцца мужчыны і жанчыны. Усе ж памятаюць пра сямейную лодку, якая разбілася аб быт. Але ўвага, паслухаем вучоных! Гэтае даследаванне, як паведамляецца, пацвердзіла, што ў асноўным так здараецца праз тое, што закаханыя не могуць прыйсці да кампрамісу... у многіх бытавых пытаннях.

Бачу, вы ўжо смеяцеся ўголас? Ну сапраўды, пагадзіцеся, па іншых матывах і ў нас мала хто расстаецца. («У судзе пара скасоўвае шлюб. У жонкі пытаюцца пра матывы. «Рэлігійныя», — адказвае тая. «І ў чым яны праяўляюцца?» — «Ён не прызнае мяне багіняй».) Зрэшты, у нечым даследаванне амерыканскіх псіхолагаў мне здалося цікавым. Наўпрост пра ўзаконенне адносін у ім не гаворыцца, таму давайце паставім знак роўнасці паміж афіцыйным шлюбам і простым сумесным пражываннем маладых людзей (каго гэтым сёння здзівіш?) і правядзем пэўныя паралелі.

«Толькі ажаніўшыся, я даведаўся, што, аказваецца, няправільна стаўлю малако ў халадзільнік».

Як высветлілі амерыканскія псіхолагі, расставанне пар адбываецца таму, што ў іх многія не хацелі ахвяраваць сваім свабодным часам або асабістай прасторай у імя кахання. Цукерачна-букетны перыяд, калі мы імкнёмся спадабацца, заваяваць сэрца абранніка — гэта адно, а пажыць са староннім чалавекам разам — зусім іншае. Думаецца, гэтыя прычыны можна назваць інтэрнацыянальнымі. Напрыклад, чуў гісторыю пра беларускую пару, якая разбеглася пасля чатырох гадоў сумеснага пражывання. Прычына была ў тым, што яны не змаглі падзяліць... ванны пакой, — каму яго займаць ранкам першаму. Як вы разумееце, справа была зусім не ў гэтай чарговасці. Нейкія прэтэнзіі адно да аднаго пакрысе назапашваліся пэўны час, пакуль не грымнулі з-за каталізатара ў выглядзе таго самага ваннага пакою. З такім жа поспехам яны маглі пасварыцца з іншай нагоды. (З адэскага гумару. «Цыля, мы ў шлюбе толькі другі дзень, а вы ўжо робіце мне нервы!» — «Фіма, можа быць, я чакала гэтага дня два гады!»)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Праз тое, што пара жыве на адной жылплошчы, хлопец з дзяўчынай праводзяць вялікую колькасць часу разам і ў выніку пачынаюць знаходзіць адно ў адным нейкія заганы. («Выпадковымі бываюць толькі шлюбы. А ў палюбоўнікі трэба браць чалавека надзейнага...») Або проста ў пары ці ў некага аднаго з сужэнцаў не спраўджваюцца першапачатковыя чаканні адносна сумеснага пражывання. («Дарагая, а што, суп учарашні?» — «Я табе больш скажу, ён яшчэ і заўтрашні».) У кожнага з нас ёсць звычкі, якія могуць быць незразумелымі суседу ці суседцы па кватэры. («Толькі ажаніўшыся, я даведаўся, што, аказваецца, няправільна стаўлю малако ў халадзільнік».) У мяне, напрыклад, шпаркая паходка, і жонка ўвесь час кажа, што не можа ўгнацца, калі мы ідзём разам. А я кожны раз жартам адказваю, што ў маім арганізме адсутнічаюць «паніжаныя перадачы», і, калі я запавольваю хаду, ногі пачынаюць чапляцца адна за адну. Нічога, пакуль жывём разам...

Што цікава, у адказах амерыканскіх добраахвотнікаў, якія ўдзельнічалі ў апытанні адносна прычын расставання са сваімі палавінкамі, адсутнічаюць скаргі на ўплыў ці нават ціск з боку бацькоў. Відаць, з той прычыны, што ў іх не заведзена, стаўшы дарослым, працягваць жыць побач з імі. Хоць і «класіку жанру» пра ўзаемаадносіны свякрові і нявесткі — амерыканскую ж камедыю «Калі свякроў — монстр» з Джэніфер Лопес і Джэйн Фондай — нельга скідваць з рахункаў. Гераіня апошняй прыязджае ў госці да будучай пары, але, па сутнасці, гэта нічога не мяняе. (Памятаеце? «Вы глядзіце на яго маці, якая міла ўсміхаецца, і так хочацца стукнуць яе патэльняй... І не раз».) У нас жа тэма найперш цешчы і, у меншай ступені, свекрыві — нумар адзін у народным фальклоры! («Зяцёк, калі я памру, вы мяне на могілках не хавайце. Лепш крэміруйце, а прах развейце па двары». — «Не, мама! Маленькі ветрык — і вы зноў у хаце?!») Вядома, па большай частцы гэтыя вобразы міфізаваныя, але, як той казаў, чаго толькі часам не бывае...

Амерыканскія псіхолагі раяць у якасці паратунку парам, якія пачынаюць жыць разам, не засяроджвацца толькі на сваёй другой палавінцы. Маўляў, баўце час з сябрамі, бывайце ў нейкіх новых месцах. А ў нас такі падыход, думаецца, можа толькі яшчэ больш справакаваць канфлікт у адносінах. («Пайшлі ў бар». — «Нельга мне ў бар». — «Паехалі на рыбалку?» — «Нельга на рыбалку». — «Не шкадуеш, што знайшоў дзяўчыну?» — «Нельга шкадаваць».) Хіба калі толькі адпачываць адно ад аднаго... сумесна?

Нехта можа прыгадаць чарговы анекдот. «Кахаю цябе такі, які я ёсць». Сапраўды, наіўна было б думаць, што дарослага чалавека можна змяніць цалкам. Але калі ёсць пачуцці, нейкія дробязі не павінны быць перашкодай. Магчыма, гэта дазволіць, як той казаў, не разысціся, як у моры караблі... («Я ад цябе сыходжу!» — «Я з табой!»)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Літаратура — гэта шлях памылак»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Твае вершы часта становяцца песнямі. Іх спяваюць гурт Zatochka, Віталь Варанко і многія іншыя. Ці заўсёды правільна прачытваецца аўтарскі пасыл?

— Я вельмі даўно вырашыў не хвалявацца наконт песень на свае тэксты. Яшчэ не чуў ідэальнай кампазіцыі на свой верш, кожны раз гэта іншае прачытанне, эмоцыі, узнаўленне, сінтэз маёй задумы з аранжыроўкай. І гэта цалкам лагічна. Ёсць і ёсць. Пярэчыць і забараняць я нікому не збіраюся. Гэта і пэўнага кшталту сімвал павагі, прыхільнасці да маёй творчасці.

— Неяк вядомы кітайскі паэт і перакладчык Сі Чуань падчас інтэрв'ю сказаў мне, што паэты пішуць толькі для сваіх калег — бо толькі яны могуць цалкам зразумець іншага паэта. А ты для каго пішаш?

— Раней, гадоў пяць ці болей таму, я, напэўна, з гарачым сэрцам сказаў бы: паэзія мусіць быць для ўсіх. Яна павінна, як раней, збіраць стадыёны, працінаць трапнымі выразамі і вобразамі сэрцы тысяч, мільёнаў чытачоў. Але з часам мне зрабілася нецікава выступаць, бачыць свае вершы надрукаванымі. Больш за тое, думаю, што іншы паэт мог бы быць больш патрэбным гэтай паперы. І паступова адзінай радасцю, якую я пачаў адчуваць, стала радасць ад самой творчасці.

«Тыя, хто цяпер прыходзяць у літаратуру, ужо атрымліваюцца паўторамі паўтораў».

Калі ты пішаш і сам разумееш: вось тут я зрабіў адкрыццё, а гэтым здзіўлю некалькі сваіх калег. Але і ўвага да думкі апошніх амаль нівелявалася. Пахваляць — добра, не пахваляць — што зробіш. Праз гэта пакутаваць не стану. Я раіў бы імкнуцца да такога стаўлення ўсім маладым аўтарам. Не перамаглі ў нейкім конкурсе — не трэба пісаць пагроз сябрам журы. Не перамог ваш сябар — пажадайце яму цярплівасці і ўдачы наступны раз. Усе гэтыя пакуты праз неперамогі і расчараванні адбіраюць у нас шмат творчай энергіі, і ў выніку некаторыя маладыя творцы запамінаюцца як скандалісты, плеткары. Сапраўдны пісьменнік — гэта яшчэ і прыклад годных паводзінаў.

— Сам сочыш за творчасцю калег, чытаеш іх новыя кнігі?

— З задавальненнем раблю гэта ў дачыненні прыкладна да двух дзясяткаў маладых беларускіх аўтараў. Мне здаецца, што пакрысе можна пачынаць ужываць паняцце «наша пакаленне» — пра тых, хто пісаў з пачатку 2000-х і прыблізна да 2015-га. У гэтыя паўтара дзесяцігоддзя вельмі актыўна з'яўляліся імёны, чыя паэзія насамрэч цікавая. Я працягваю шукаць новых творцаў і ўжо адчуваю разрыў пакаленняў: не ўсё разумею, не ўсё прымаю. Не ўсе спосабы гульні са словам здаюцца мне цікавымі. Я не кажу, што сярод іх няма добрых паэтаў, але вось ужо два ці тры гады сярод аўтараў да 25 гадоў няма такіх, хто б мяне здзівіў...

— Што не так з маладымі?

— Усё паўторы, усё гэта я чытаў у аўтараў свайго пакалення. Магчыма, і наша было паўторам кагосьці. Але тыя, хто цяпер прыходзіць у літаратуру, ужо атрымліваюцца паўторамі паўтораў. Можна сказаць, што гэта пераемнасць, але часцей я бачу прагу займець тую самую папулярнасць, з якой мы пачыналі размову, а не імкненне знайсці нешта новае, здзівіць калег і слухачоў. Гэта мяне насцярожвае.

— Ты ж не маеш дыплома філолага. Што параіш тым, хто хоча пісаць, але не ведае, як?

— Мне здаецца, што філалагічная адукацыя паэту вельмі замінае. У мяне быў такі комплекс: калі я толькі рабіў першыя крокі ў літаратуры, здавалася, што мне бракуе начытанасці. Я нават скардзіўся старэйшым сябрам-літаратарам на гэты свой недахоп і падумваў пайсці вучыцца на філфак проста дзеля спіса літаратуры. Мне сказалі, што гэтага ні ў якім разе не трэба рабіць. Прабелы ў самаадукацыі, наадварот, ствараюць магчымасці. Хай буду вынаходзіць ровар, прыдумваць прыёмы, якія да мяне ўжо тысячу разоў прыдуманыя і забытыя, але пры пэўнай упартасці прайду гэты шлях натуральна.

— Дык што рабіць чалавеку, які вельмі хоча быць паэтам?

— Патрэбны дзве рэчы, якія мусіць рабіць і першакласнік, — шмат чытаць і шмат пісаць. Толькі на самым вышэйшым узроўні. Чытаць запоямі сур'ёзную літаратуру. Шмат пісаць, бо літаратура — гэта не шлях спроб, а шлях памылак. Трэба ўсе памылкі самому зрабіць, усвядоміць, што гэта менавіта памылкі. Знаходзіць прыёмы, якія працуюць і з'яўляюцца ўласна вашымі, развіваць, памнажаць іх, імкнуцца, каб тэксты ўражвалі як мага даўжэй не толькі вашых сяброў, але і вас саміх.

«Ужо адчуваю разрыў пакаленняў: не ўсё разумею, не ўсё прымаю. Не ўсе спосабы гульні са словам здаюцца мне цікавымі».



— Ці чакаць прыхільнікам новую кнігу паэзіі Віталя Рыжкова?

— Найбліжэйшым часам не. Выпусціўшы першую пяць-шэсць гадоў таму, я зразумеў, што наступныя 5 гадоў пра другую нават думаць не буду. Не бывае дзесяцітомніка добрых вершаў. Сваю першую кнігу я пісаў 8 гадоў, з гэтага перыяду свайго жыцця выбраў толькі 35 вершаў. Працягваю пісаць, але нават яшчэ не спрабаваў складаць творы ў адну папку. Я ведаю гісторыю, якую хачу расказаць прынамсі трыма сваімі кнігамі, але збіраюся іх пісаць ледзь не да канца жыцця.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 14.09.2016 г.

■ З нагоды

ТЭРЫТОРЫЯ НЕ-ЦІШЫНІ

5 прычын успомніць дарогу да бібліятэкі

У сучасным імклівым свеце да высокага тэмпу жыцця мусяць прыстасоўвацца, змяняцца, развівацца нават самыя зацятыя кансерватары. Таму лагічна, што і бібліятэкі не стаяць на месцы і, апроч кніг, газет і часопісаў, прапануюць сваім наведвальнікам мноства дадатковых паслуг. Ужо нават не варта чарговы раз падкрэсліваць татальную змену іміджу сферы: сёння бібліятэка — не проста захавальніца і «пазычальніца» кніг, але паўнавартасны культурны цэнтр, дзе можна пабачыць мноства цікавінак. А бібліятэкар — не строгая жанчына ў акулярах з высокай прычоскай, а асоба крэатыўная, вясёлая, ініцыятыўная. Таму надзвычай радуе той факт, што вядомую фразу «Цішыня павінна быць у бібліятэцы!» можна назаўсёды адмяніць.

Зрэшты, не ўсе памятаюць пра тыя «бонусы», што мы атрымліваем, стаўшы наведвальнікамі бібліятэкі. І менавіта сёння, калі ў нашай краіне адзначаецца Дзень бібліятэк, варта згадаць некаторыя з прычын, чаму трэба здзьмухнуць пыл са свайго чытацкага білета і нарэшце завітаць у гэтую ўстанову.

1. Калі сумна, тут можна знайсці забавы пад свой густ. Варта памятаць, што бібліятэка сёння — гэта перадусім плацоўка, на якой знаходзяць прытулак самыя розныя творчыя ініцыятывы. Гэта не толькі «кропкавыя» мерапрыемствы (але і іх варта мець на ўвазе), але і сталыя суполкі. Клуб аматараў чытання, таварыства настольных гульняў, гурток вязальшчыц-вышывальшчыц ці аб'яднанне прыхільнікаў мастацтва арыгамі. Я, вядома, жартую, але і ў гэтым жарце ёсць доля праўды. Зазірніце ў бліжэйшую бібліятэку, магчыма, там ужо збіраецца нейкая суполка, да якой можна далучыцца і знайсці аднадумцаў.

2. А калі суполкі няма, то яе магчыма арганізаваць. Звярніцеся з такой прапановай да бібліятэкара і, я ўпэўнена, яе падтрымаюць. Установе зусім не складана адвесці невялікі куточак для вас і вашых сяброў. Дома ж збірацца не заўсёды зручна. А раптам і іншыя наведвальнікі заўважаць групку, далучацца і сяброў прывядуць. Бо калі гараджаніну вельмі проста знайсці спосаб культурна бавіць час ці проста сабрацца кампаніяй, каб пагаманіць, то ў вёсцы з гэтым намнога складаней. Дык навошта чакаць, калі нехта прыйдзе і будзе вас забаўляць? Гэта можна рабіць самім. У бібліятэцы.

3. Тут можна пазычыць кнігі бясплатна ці нават атрымаць іх у падарунак. Сёння часта можна пачуць скаргі накшталт: кнігі не чытаю і не набываю, бо 1) яны дарагія, 2) у нашай мясцовасці няма кнігарні. Але ж бібліятэкі ёсць! Многія чамусьці забыліся, што скарыстацца іх паслугамі можна абсалютна бясплатна (або за невялікія грошы, калі гаворка ідзе пра спецыяльны фонд). Тым больш каштоўнымі паслугі бібліятэкі становяцца для сем'яў з дзецьмі: так можна атрымаць вялікі запас кніг для чытання і навучыць дзіця беражлівым адносінам да рэчаў: кнігі ж трэба вяртаць у добрым стане. Больш за тое, многія бібліятэкі сёння арганізоўваюць спецыяльныя паліцы для буккросінгу. Калі кніга, змешчаная тут, спадабалася — маеце поўнае права пакінуць сабе, калі не — можна зноў вярнуць на паліцу, дзе яна будзе чакаць наступнага чытача.

Гэта цікава!

✓ **Дзень бібліятэк адзначаецца ў Беларусі з 2001 года ў адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы. Дата выбрана не выпадкова — у гонар заснавання галоўнай кніжніцы краіны, Нацыянальнай бібліятэкі.**

✓ **Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, на пачатак года ў Беларусі працавала 2,9 тысячы публічных бібліятэк, іх агульны фонд складае амаль 60 мільёнаў асобнікаў кніг, часопісаў, рукапісаў і іншых крыніц інфармацыі.**

✓ **На адну бібліятэку ў сярэднім прыпадае 21 тысяча асобнікаў бібліятэчнага фонду. З іх 18 асобнікаў — на аднаго чытача.**

4. Ёсць доступ да інтэрнэту і многіх электронных рэсурсаў. Так, у наш век інфармацыйных рэсурсаў гэты аспект усё яшчэ актуальны. Не ўсе жыхары вёсачак маюць дома камп'ютары з выхадам у сеціва. Не ўсе могуць сабе дазволіць набываць дарагія базы даных, даведнікі і слоўнікі. А ў бібліятэках яны ёсць! Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, на пачатак гэтага года доступ у інтэрнэт мелі каля 68 працэнтаў публічных бібліятэк краіны і, думаю, гэтая лічба з кожным годам будзе толькі павялічвацца.

5. Можна больш даведацца пра свой родны край і пабываць у міні-музеі. Сёння бібліятэкі (а часта менавіта яны — адзіныя культурныя ўстановы мясцовасці) разам з іншымі выконваюць ролю захавальніц народных скарбаў. Тут размяшчаюцца тэматычныя этнаграфічныя экспазіцыі, а супрацоўнікі вядуць работу па зборы звестак пра мінуўшчыну краю. Таму калі вучням ці студэнтам трэба напісаць рэферат пра гісторыю мясцовасці, прадставіць праект пра тое, як жылі продкі, то лепш адразу крочыць у бібліятэку. Тут вы дакладна знойдзеце тое, пра што «Вікіпедыя» нават не здагадваецца.

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

Каб не апынуцца на востраве

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для непадрыхтаванага гледача, які трапіў на падобную дзею ўпершыню, відаць, напачатку шмат што здалося незразумелым. Таму некаторыя з маладых людзей адкрывалі тэкст п'есы Чэхава на ўласных смартфонах і спрабавалі супаставіць яго з тым, што адбывалася на плошчы. Але ж рабілі гэта дарэмна. Тэкст тут быў зусім не галоўным, яго можна было наогул не ведаць. Рэжысёр Яраслаў Федарышын паказаў сваю інтэрпрэтацыю твора праз прыёмы вулічнага тэатра. Ды на мове жэстаў і позіркаў можна сказаць часам больш, чым словамі. Спектакль у розныя яго моманты можна было назваць філасофскай прыпавесцю, роздумам, феерыяй. Белыя крылы, якія герой «Чайкі» Косця Траплёў дорыць іншым удзельнікам дзеі, усяляюць веру, заварожваюць. Але крылы — гэта не толькі ветразі надзеі, гэта смутак істоты з надламаным крылом. Калі ўважліва сочыш за тым, што адбываецца, з'яўляецца нейкі дзіўны эфект 3D — тваёй прысутнасці сярод дзеі. У гэтым і фішка рэжысёра: ён гэта зрабіў — прымусіў здзіўляцца, здагадвацца, суперажываць і думаць... Пра каханне, мары, проста пра існасць жыцця. А калі на сцэну вывозяць велізарныя драўляныя шкілеты дыназаўраў, скурай адчуваеш, як усё праходзіць. Пройдзе і наш час разам з намі. Таму варта жыць сёння, адчуваць, радавацца, любіць! Калі нас вось на гэтай плошчы прымусілі адчуць гэта, то варта крыкнуць «брава!» і рэжысёру, і ўсёй яго камандзе.

«Дванаццатая ноч»
Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

Фрагмент адкрыцця.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ВЕЛЬМІ няпростая для асэнсавання работа Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра **«Казіны востраў»**. І справа крытыкаў разбіраць па палiцах прафесіянальныя знаходкі ці няўдачы аўтараў пастаноўкі. Але я паставіла б вялікі плюс насупраць названай тэатральнай падзеі нашага фестывалю. Аўтары вызначылі спектакль як містычную гісторыю-прыпавесць. І менавіта як прыпавесць аб мужчынах і жанчынах, аб страсцях чалавечых яна вельмі чапляе. Піцерскі рэжысёр Іскандэр Сакаеў увасобіў на сцэне п'есу італьянскага пісьменніка Уга Бэтці «Казіны востраў», напісаную ў 1946 годзе. Казіны востраў — дзіўнае маркотнае месца, дзе ў вялікім старым доме жывуць тры жанчыны: маці, дачка і цётка, яна ж залвіца. Галава сям'і, не вельмі зразумела як, трапіў ці то ў турму, ці то ў фашысцкі канцлагер і там загінуў. Жанчыны валодаюць казіным статкам, з яго, падобна на тое, і кормяцца. Жыццё іх аднастайнае, кожная паасобку пакутуе ад адзіноты. Але ў іх доме нечакана паяўляецца мужчына, які быў у зняволенні разам з гаспадаром дома, таму і даведаўся пра іх. Анджэла — крыху дзіўны чалавек. Ён умела карыстаецца жаночай тугой па каханні і нядрэнна ўладкоўваецца. Жыве як сапраўдны дармаед за іх кошт і пры гэтым не абыходзіць увагай ніводную. А жанчыны — што з імі робіцца? Нібы д'ябал пацешыўся, калі прымусіў кожную агаліць усё сваё душэўнае чарноцце. Асабліва старэйшая з іх, Агата, здаецца, страчвае канчаткова чалавечае аблічча... Гэта павінна было дрэнна скончыцца, а сканчаецца вельмі дрэнна. Двое герояў гінуць. Не варта выракацца чалавечага ні для чога, бо любы востраў ці нават мацярык могуць стаць востравам слёз і магілай для душы — так міжволі думаецца ў фінале. І гэта толькі сціслы пераказ зместу таго, што адбывалася. Насамрэч там адбывалася нешта больш значнае. Аднымі з галоўных герояў спектакля, відаць, можна назваць і коз. Яны перыядычна выбягаюць на сцэну ў адмысловых касцюмах, іх танцы надзвычай пластычныя, і яшчэ яны выдаюць гукі на нейкіх асаблівых інструментах. Апошняе стварае дадатковае напружанне, часам гучыць як набат, папярэджанне.

І праўда, тут і козы закрычаць, калі людзі нясуцца напрасткі ў пекла, калі маці становіцца саперніцай дачкі, калі жанчына і маці вырашае пакараць былога палюбоўніка і аддае яго на пакутніцкую смерць. Спектакль пранікае ў душу.

БЫЛІ вялікія спадзяванні на монаспектакль тэатра «Руская сцэна» з Германіі «Рудольф Нурыеў. 48 гадзін». Па-першае, фестывальны жанр тэатра аднаго акцёра інтрыгуе. Па-другое, шмат абяцае цікавы матэрыял, за які ўзялася рэжысёрка Іна Сакалова-Гардон. Славуты савецкі балетмайстар Рудольф Нурыеў не вяртаецца пасля гастроляў з Францыі ў 1961 годзе. Ён строіць сваё жыццё на Захадзе, танцуе па ўсім свеце з трыумфам. Але на радзіме ён завочна прыгавораны да турэмнага зняволення. І ў 1988 годзе яму адкрываюць візу на 48 гадзін, каб наведаў ва Уфе маці, якая памірае. Гэтую гісторыю мы чуем з вуснаў артыста, які выконвае ролю Рудольфа Нурыева. Ёсць музыка, ёсць пластыка, ёсць маналогі, часам удалыя, трапляюцца вельмі пранікнёныя дэталі, якія яркімі штрыхамі абмалёўваюць вялікую трагедыю чалавека мастацтва — майстра, якому не хапіла размаху на радзіме, якому не даравалі... Але гісторыя не захоплівае цалкам, не прымушае глядзець ва ўсе вочы на сцэну і лавіць дзею на адным дыханні. Увесь час чакаеш, што адбудзецца нешта яшчэ, што градус напругі вырасце. Так і пакідаеш залу з чаканнем.

Некаторыя з маладых людзей адкрывалі тэкст п'есы Чэхава на ўласных смартфонах і спрабавалі супаставіць яго з тым, што адбывалася на плошчы.

І ўсё ж назаўтра закарцела адкрыць «Вікіпедыю», пачытаць біяграфію Нурыева, паглядзець яго фотаздымкі, каб пасля роздуму пра вялікага мастака танца зноў пераканацца, што спектакль атрымаўся і не моцны, і не зусім слабы.

...Фестываль працягваецца. Упершыню на ім выступаў тэатр з Казахстана «Жастар тэатры». Манера іх выканання, крыху пафасная, спачатку здаецца нам даволі дзіўнай. Потым разумееш, што перад табой іншая культура, вартая таго, каб з ёй пазнаёміцца. Для гэтага ж і ладзяцца фестывалі!..

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Будзем знаёмыя!

Прафесія — Педагог!

Банеры з партрэтамі самых лепшых прадстаўнікоў педагагічнай прафесіі павінны з'явіцца на вуліцах беларускіх гарадоў напярэдадні Дня настаўніка. Ініцыятарам сацыяльнай рэкламы выступіла Міністэрства адукацыі нашай краіны.

Як расказала журналісту «Звязды» прэс-сакратар ведамства Юлія БАРАДУН, праект стартуе з плеяды настаўнікаў, якія ўжо шмат гадоў паспяхова рыхтуюць алімпіяднікаў — іх вучні з'яўляюцца пераможцамі і прызёрамі рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіяд. Сярод іх — настаўнікі матэматыкі мінскай гімназіі №41 Барыс Камракоў і Леанід Лаўрыновіч, настаўнік інфарматыкі сярэдняй школы № 11 горада Слуцка Уладзімір Жук, настаўнік фізікі брэсцкага ліцэя №1 імя А.С. Пушкіна Міхаіл Макаед, настаўніца геаграфіі сталічнай сярэдняй школы №73 Вольга Гузава, настаўніца рускай мовы і літаратуры Магілёўскага абласнога ліцэя Алена Чудоўская і іншыя.

«Сапраўдны поспех магчымы, толькі калі таленавіты вучань сустракаецца з таленавітым педагогам. Нездарма кажуць, што талент — гэта 90 працэнтаў працы, а ўсё іншае — ад Бога. Таму вялікая ўдзячнасць настаўнікам-энтузіястам, якія вельмі беражліва адшліфоўваюць кожную грань талента сваіх вучняў, даводзячы яго да дасканаласці», — падкрэсліваюць у міністэрстве.

Героямі наступных серый сацыяльнай рэкламы стануць педагогі года, найлепшыя прадстаўнікі дашкольнай, спецыяльнай і дадатковай адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

І РАБОТА БУДЗЕ ЛАДЗІЦЦА

Новы інтэрнат для маладых спецыялістаў адкрылі ў Навагрудку.

Па словах **намесніка старшыні Навагрудскага райвыканкама Святланы КАРАЛЬКО,** для арганізацыі жылля маладым спецыялістам у райцэнтры быў рэканструяваны адзін са старых інтэрнатаў, які не выкарыстоўваўся больш за 10 гадоў.

Работы праведзены па ініцыятыве мясцовай улады, на рамонт і абсталяванне інтэрната затрачана больш як Br5 млрд (да дэнамінацыі). Аднапавярховы будынак цалкам абноўлены, прыбудавана новая кухня, у інтэрнаце блокавай сістэмы абсталявана асобная кухня, пральня, душавыя, закуплена мэбля ў кожны блок, добраўпарадкавана тэрыторыя.

Жыллё ў ім атрымалі больш за 30 маладых спецыялістаў з розных куткоў краіны, якія прыбылі на сваё першае месца працы ва ўстановы сацыяльнай сферы Навагрудскага раёна. «Пытанне жылля для маладых спецыялістаў з'яўляецца вельмі актуальным, паколькі штогод ёсць патрэба ў абнаўленні кадраў сацыяльнай сферы, да нас прыбываюць урачы, настаўнікі, работнікі культуры, а для маладога чалавека жыллё — самае галоўнае пытанне», — патлумачыла намеснік старшыні райвыканкама.

Дарэчы, усяго сёлета ў Навагрудскі раён прыбылі на першае месца працы 52 спецыялісты ў сферу адукацыі, 16 урачоў і 4 работнікі культурнай сферы.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

ДЗЕТКІ І МАНЕТКІ

